ПРОЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!   Субота 22 студзеня 1938 г., № 4 (346)   Цана 20 кап

ЛІТАРАТУРА і МАСТАЦТВА

Орган праўлення ССПБ і Упраўлення па справах мастацтваў пры СНК БССР

14 ГОД БЕЗ ЛЕНІНА—ЛЕНІНСКІМ ШЛЯХАМ ПАД КІРАЎНІЦТВАМ ВЯЛІКАГА СТАЛІНА

І. В. СТАЛІН

АБ ЛЕНІНУ

З прамовы на вечары крэмлёўскіх курсантаў 28 студзеня 1924 года

Горны арол

Упершыню я пазнаёміўся з Леніным у 1903 годзе. Праўда, гэта знаёмства было не асабістае, а завочнае, у парадку перапіскі. Але яно пакінула ва мне незагладнае ўражанне, якое не пакідала мяне за ўвесь час маёй работы ў партыі. Я знаходзіўся тады ў Сібіры, у ссылцы. Знаёмства з рэвалюцыйнай дзейнасцю Леніна з канца 90-х год і асабліва пасля 1901 года, пасля выдання «Искры», прывяло мяне да пераканання, што мы маем у асобе Леніна чалавека незвычайнага. Ён не быў тады ў маіх вачах простым кіраўніком партыі, ён быў яе фактычным стваральнікам, бо ён адзін разумеў унутраную сутнасць і неадкладныя патрэбы нашай партыі. Калі я параўноўваў яго з астатнімі кіраўнікамі нашай партыі, мне ўвесь час здавалася, што саратнікі Леніна— Плеханаў, Мартаў, Аксельрод і другія — стаяць ніжэй Леніна на цэлую галаву, што Ленін у параўнанні з імі не проста адзін з кіраўнікоў, а кіраўнік вышэйшага тыпу, горны арол, які не ведае страху ў барацьбе і смела вядзе наперад партыю па няведаных шляхах рускага рэвалюцыйнага руху. Гэта ўражанне так глыбока запала мне ў душу, што я адчуў неабходнасць напісаць аб ім аднаму свайму блізкаму другу, які знаходзіўся тады ў эміграцыі, патрабуючы ад яго водгуку. Праз некалькі часу, будучы ўжо ў ссылцы ў Сібіры, — гэта было ў канцы 1903 года, — я атрымаў натхнёны адказ ад майго друга і простае, але глыбока змястоўнае пісьмо Леніна, якога, як аказалася, пазнаёміў мой друг з маім пісьмом. Пісьмо Леніна было параўнаўча невялікае, але яно дазала смелую, бясстрашную крытыку практыкі нашай партыі і надзвычай ясны і сціслы перказ усяго плана работы партыі на бліжэйшы перыяд. Толькі Ленін умеў пісаць аб самых заблытаных рэчах так проста і ясна, сцісла і смела — калі кожны сказ не гаворыць, а страляе. Гэта простае і смелае пісьмо яшчэ больш умацавала мяне ў тым, што мы маем у асобе Леніна горнага арла нашай партыі. Не магу сабе дараваць, што гэта пісьмо Леніна, як і многія іншыя пісьмы, па прывычцы старога падпольшчыка, я спаліў.

З гэтага часу пачалося маё знаёмства з Леніным.

Вера ў масы

Тэарэтыкі і правадыры партый, ведаючыя гісторыю народаў, праштудзіраваўшыя гісторыю рэвалюцый ад пачатку да канца, бываюць іншы раз адзяржымы адной непрыстойнай хваробай. Хвароба гэта называецца баязню мас, нявер'ем у творчыя здольнасці мас. На гэтай глебе ўзнікае іншы раз нейкі арыстакратызм правадыроў у адносінах да мас, не спакушаных у гісторыі рэвалюцый, але закліканых ламаць старое і будаваць новае. Баязнь, што стыхія можа разбушавацца, што масы могуць «паламаць шмат лішняга», жаданне разыграць ролю мамкі, якая імкнецца вучыць масы па кніжках, але не жадае вучыцца ў мас, — такая аснова гэтага роду арыстакратызма.

Ленін прадстаўляў поўную супроцьлегласць такім правадырам. Я не ведаю другога рэвалюцыянера, які так глыбока верыў-бы ў творчыя сілы пролетарыята і ў рэвалюцыйную мэтазгоднасць яго класавага інстынкту, як Ленін. Я не ведаю другога рэвалюцыянера, які ўмеў-бы так бязлітасна бічаваць самазадаволеных крытыкаў «хаосу рэвалюцыі» і «вакханаліі самачынных дзеянняў мас», як Ленін. Помніцца, як у часе адной гутаркі, у адказ на заўвагу аднаго з таварышоў, што «пасля рэвалюцыі павінен устанавіцца нармальны парадак», Ленін саркастычна заўважыў: «бяда, калі людзі, якія жадаюць быць рэвалюцыянерамі, забываюць, што найбольш нармальным парадкам у гісторыі з'яўляецца парадак рэвалюцыі».

Адсюль пагардлівыя адносіны Леніна да ўсіх тых, якія імкнуліся звысоку глядзець на масы і вучыць іх па кніжках. Адсюль нястомная пропаведзь Леніна: вучыцца ў мас, асэнсаваць іх дзеянні, дасканала вывучаць практычны вопыт барацьбы мас.

Вера ў творчыя сілы мас — гэта тая самая асаблівасць у дзейнасці Леніна, якая давала яму магчымасць асэнсаваць стыхію і накіроўваць яе рух у рэчышча пролетарскай рэвалюцыі.

Геній рэвалюцыі

Ленін быў народжаны для рэвалюцыі. Ён быў паісціне геніем рэвалюцыйных узрываў і найвялікшым майстрам рэвалюцыйнага кіравання. Ніколі ён не адчуваў сябе так свабодна і радасна, як у эпоху рэвалюцыйных патрасенняў. Гэтым я зусім не хачу сказаць, што Ленін аднолькава адобрываў усякае рэвалюцыйнае патрасенне ці што ён заўсёды і пры ўсякіх умовах стаяў за рэвалюцыйныя ўзрывы. Ніколькі. Гэтым я хачу толькі сказаць, што ніколі геніяльная празорлівасць Леніна не праяўлялася так поўна і выразна, як у часе рэвалюцыйных узрываў. У дні рэвалюцыйных паваротаў ён літаральна расцвітаў, станавіўся яснавідцам, прадугадваў рух класаў і магчымыя зігзагі рэвалюцыі, бачачы іх, як на далоні. Нездарма гаворыцца ў нашых партыйных кругах, што «Ільіч умее плаваць у хвалях рэвалюцыі, як рыба ў вадзе». Адсюль «паразіцельная» **яснасць** тактычных лозунгаў і «галавакружыцельная» **смеласць** рэвалюцыйных замыслаў Леніна.

Успамінаюцца два асабліва характэрных факты, якія адзначаюць гэту асаблівасць Леніна.

ПЕРШЫ ФАКТ. Перыяд перад Кастрычніцкім пераваротам, калі мільёны рабочых, сялян і салдатаў, падганяемыя крызісам у тылу і на фронце, патрабавалі міру і свабоды; калі генералітэт і буржуазія падрыхтоўвалі ваенную дыктатуру ў інтарэсах «вайны да канца»; калі ўся так званая «грамадская думка», усе так званыя «соцыялістычныя партыі» стаялі супроць бальшэвікоў, трэціруючы іх «нямецкімі шпіёнамі»; калі Керэнскі спрабаваў загнаць у падполле — і часткова паспеў ужо загнаць — партыю бальшэвікоў; калі ўсё яшчэ магутныя дысцыплінаваныя арміі аўстра-германскай кааліцыі стаялі супроць нашых стомленых і раскладаўшыхся армій, а заходне-еўрапейскія «соцыялісты» благапалучна заставаліся ў блоку са сваімі ўрадамі ў інтарэсах «вайны да поўнай перамогі»...

Што значыла ўзняць паўстанне ў такі момант? Узняць паўстанне ў такой абстаноўцы — гэта значыць паставіць усё на карту. Але Ленін не баяўся рыскнуць, бо ён ведаў, бачыў сваім яснавідушчым позіркам, што паўстанне немінуча, што паўстанне пераможа, што паўстанне ў Расіі падрыхтуе канец імперыялістычнай вайны, што паўстанне ў Расіі ўскалыхне змучаныя масы Захаду, што паўстанне ў Расіі ператворыць вайну імперыялісцкую ў вайну грамадзянскую, што паўстанне дасць Рэспубліку советаў, што Рэспубліка советаў паслужыць аплотам рэвалюцыйнага руху ва ўсім свеце.

Вядома, што гэта рэвалюцыйнае прадбачанне Леніна збылося пазней з нябачанай дакладнасцю.

ДРУГІ ФАКТ. Першыя дні пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі, калі Совет Народных Камісараў спрабаваў прымусіць мяцежнага генерала, галоўнакамандуючага Духоніна, спыніць ваенныя дзеянні і адкрыць перагаворы з немцамі аб перамір'і. Помніцца, як Ленін, Крыленка (будучы галоўнакамандуючы) і я накіраваліся ў Галоўны штаб у Піцеры к проваду для перагавораў з Духонінем. Мінута была жудасная. Духонін і Стаўка катэгарычна адмовіліся выканаць загад Соўнаркома. Каманды склад арміі знаходзіўся цалкам у руках Стаўкі. Што датычыць салдатаў, дык невядома было, што скажа 12-мільённая армія, падначаленая так званым армейскім арганізацыям, настроеным супроць Совецкай улады. У самім Піцеры, як вядома, наспявала тады паўстанне юнкераў. Акрамя таго, Керэнскі ішоў на Піцер вайной. Помніцца, як пасля некаторай паузы ля провада твар Леніна засвяціўся якімсьці незвычайным святлом. Відаць было, што ён прыняў ужо рашэнне. «Пойдзем на радыёстанцыю, — сказаў Ленін, — яна паслужыць нам на карысць: мы адхілім у спецыяльным загадзе генерала Духоніна, прызначым на яго месца галоўнакамандуючым т. Крыленка і звернемся да салдатаў праз галаву каманднага складу з заклікам—абкружыць генералаў, спыніць ваенныя дзеянні, звязацца з аўстра-германскімі салдатамі і ўзяць справу міру ў свае ўласныя рукі».

Гэта быў «скачок у невядомасць». Але Ленін не баяўся гэтага «скачка», наадварот, ён ішоў яму насустрач, бо ён ведаў, што армія хоча міру і яна заваюе мір, змятаючы па шляху да міру ўсе і ўсякія перашкоды, бо ён ведаў, што такі спосаб сцвярджэння міру не пройдзе дарма для аўстра-германскіх салдатаў, што ён развяжа цягу да міру на ўсіх без выключэння франтах.

Вядома, што гэта рэвалюцыйнае прадбачанне Леніна таксама збылося пазней з усёй дакладнасцю.

Геніяльная празорлівасць, здольнасць хутка схапліваць і разгадваць унутраны сэнс насоўваючыхся падзей — гэта тая самая ўласцівасць Леніна, якая дапамагала яму вызначаць правільную стратэгію і ясную лінію паводзін на паваротах рэвалюцыйнага руху.



В. І. Ленін гутарыць з І. В. Сталіным на кватэры рабочага ў Петраградзе (1917 год). Малюнак мастака П.

ВЕКАПОМНАЯ ДАТА

Будзе жыць у вяках гэта дата,
Гэты дзень будуць помніць вякі.
Свет не ведаў яшчэ такой страты,
Слёз жалобных і сумных такіх.
Гэты дзень незабыўным ударам
Лёг у сэрцах мільёнаў людзей.
Скончыў шлях правадыр пролетараў
У зімовы засмучаны дзень.
Смерць найлепшага вырвала сына
У працоўных сусвету ўсяго.
Ціха слёзы раняла краіна,
Апавітая чорнай тугой.
Быў марозны, абветраны студзень,
У прасторах бялелі снягі,
З гарадоў і палёў нашых людзі
Развітацца ішлі з дарагім.
Развітацца з любімым і родным
Чалавекам вялікай зямлі,
Раскаваных рэспублік народы
Згуртаванай кагортай ішлі.
І давалі душою прысягу
Шляхам ленінскім цвёрда ісці,
Быць адданымі Леніна сцягу,
Несці вечна яго у жыцці.
Гэты сцяг, што ў баях здабывалі
Нам бацькі і браты, і дзяды,
Сёння ўзняў над радзімаю Сталін·
Слаўны ленінец — наш правадыр.
Сёння песняю простай, цудоўнай
Славяць ленінскі сцяг песняры.
Над сусветам народаў працоўных
Слава Леніна сонцам гарыць.

М. ДЗЯДЗЮЛЯ.

КЛЯТВА ПРАВАДЫРА

Снягамі занесены сцежкі, гасцінцы,
Шырокія стэпы, гушчары, лугі...
З граніцы заходняй да ўсходняй граніцы
Іскрацца, як прысак гарачы, снягі.
У гэтую пору нідзе не праехаць,
У гэтую пору нідзе не прайсці:
Праносіцца вецер спюдзёны па свеце,
Руйнуе шляхі, замятае пуці.
Не ведае ён ні дарогаў, ні трактаў—
Усюды прастора яму, шырыня...
Спыніся ля хаты, ой, вецер крылаты,
Скажы пра навіны зімовага дня!
І вецер спыніўся.
Крылом сваім белым
Яшчэ ўзмахнуў і прылёг на зямлі.
З ім скруха-журба ад Масквы прыляцела,
І слёзы з вачэй у людзей пацяклі.
Наўкола снягі ад тугі пачарнелі,
Заплакалі горка, наўзрыд правады,
Агністае сонца на міг пацямнела —
Згас светач наш ясны, зямлі правадыр.
Па сопкіх дарогах, па снежных гасцінцах
Пайшлі і пайшлі тады людзі наўсцяж —
Да роднай Масквы, да чырвонай сталіцы.
Дзе схілен да долу праслаўлены сцяг;
Дзе ў суме-жалобе задумлівы Сталін
У Доме Саюзаў з народам стаіць...
Тры разы гудкі над зямлёй пракрычалі,
І кожны дыханне у сэрцы стаіў.
Суровую клятву сказаў тады Сталін
Над бацькавай роднай маўклівай трунай.
І клятву народы за ім паўтаралі,
З ім рушылі ленінскім шляхам у бой.

**

Жыве твая клятва, жыве, правадыр!
Зіма упрыгожыла вёскі, сады...
Па трактах, гасцінцах гамонка ідзе —
Калгас у сталіцу праводзіць гасцей.
На сесію едуць мае землякі —
Дзяды барадатыя і юнакі.
На сесію едуць землячкі мае.
Сталіца, адкрый ім палацы свае!
Вязуць яны радасцяў цэлу гару
Вялікаму Сталіну, правадыру,
З трыбун заяўляюць на цэлы сусвет:
Жыве, правадыр, твая клятва!
Жыве!

Міхась КАЛАЧЫНСКІ.

АРОЛ

(Казка)

За гарамі, ды за высокімі,
За марамі, ды за шырокімі,
Была цёмная краіна голаду.
А ў краіне той жылі з веку ў век
Птушкі быстрыя, птушкі розныя,
Гаспадарыў там злосны цар-мядзведзь.
Ён на троне сядзеў, ды ў золаце.
У яго было шмат паганых слуг:
Ваўкі шэрыя, лісы хітрыя.
Птушкі-ж бедныя знемагаліся
На рабоце цяжкой, на катаржнай,
Пралівалі пот, горка плакалі.
А ў краіне той быў такі загад:
Як народзяцца ў птушкі дзетачкі,
Каб іх смажылі на абед цару.
Вось прыходзіць воўк к шустрай ластаўцы
І гаворыць так: «Аддавай дзяцей!»
Закружылася птушка-ластаўка:
«Як тут быць, што рабіць?» —
Шкода дзетачак!
«Пачакай крыху, — кажа ластаўка, —
Дай апошні раз паглядзець на іх».
А сама стралой — ў неба сіняе
Узвілася хутка-спрытненька,
Паляцела цераз мора чорнае,
Цераз горы снежныя, высокія.
Прыляцела к арлу дужаму,
Расказала ўсё пра няшчасны лёс
Сваіх дзетачак-малалетачак.
Раптам крыллямі ўзмахнуў арол
І аблётаў край цемры, голаду.
Сабраў армію ён птушыную.
Прыляцеў туды, к беднай ластаўцы.
Як убачыў воўк арла дужага,
Дык затросся ўвесь, завыў голасам,
І хутчэй пабег ратавацца ў лес.
Ён забраўся там у нару цёмную.
А арол з сваёй смелай арміяй
Заваліў нару зямлёй, дрэвамі.
І паганы воўк задыхнуўся там...
Прыляцеў арол к цару лютаму,
Разарваў яго на кавалачкі,
Перабіў яшчэ шмат ваўкоў, лісіц.
А астатнія служкі царавы
Уцякалі, з страху, кучамі
У другія краіны голаду...
Зажылі тады птушкі весела,
Бо няма каму піць іх кроў і пот.
Самі робяць усё для саміх сябе.
І так радасна стала ў краі тым...

Але зноў бяда: служкі царавы
Цёмнай хмараю, ды з усіх бакоў,
Абкружылі край птушак радасных.
Палілася кроў, загула зямля.
І пачаўся дождж з свінца, волава,
Узмахнуў ізноў арол крыллямі,
Склікаў армію сваю дужую,
І разбіў, разнёс усіх ворагаў...
Сонца яснае засвяцілася,
Саграваючы новы, светлы край.
Вось памёр арол—бацька птушак тых,
Загулі гудкі, ды жалобна так,
А з вачэй ракой слёзы коцяцца.
Пахавалі яго ў доме мрамарным:
«Дык бывай арол, слаўны Ленін наш!»
І тады ўзляцеў над краінаю
Верны друг арла—Сталін, бацька наш,
І павёў усіх шляхам Леніна
К жыццю светламу, долі, радасці.

Васіль ГАЎРУК.
VII клас, доктаравіцкай НСШ,
Слуцкі раён.

В. І. ЛЕНІН

АБ КУЛЬТУРЫ

«Без яснага разумення таго, што толькі дакладным веданнем культуры, створанай усім развіццём чалавецтва, толькі перапрацоўкай яе можна будаваць пролетарскую культуру — без такога разумення нам гэтай задачы не вырашыць. Пролетарская культура не з'яўляецца выскачыўшай невядома адкуль, не з'яўляецца выдумкай людзей, якія называюць сябе спецыялістамі па пролетарскай культуры. Гэта ўсё суцэльная бязглуздзіца. Пролетарская культура павінна з'явіцца законамерным развіццём тых запасаў ведаў, якія чалавецтва выпрацавала пад гнётам капіталістычнага грамадства, памешчыцкага грамадства, чыноўніцкага грамадства. Усе гэтыя шляхі і дарожкі падводзілі і падводзяць, і прадаўжаюць падводзіць да пролетарскай дыктатуры гэтак-жа, як палітычная эканомія, перапрацаваная Марксам, паказала нам тое, да чаго павінна прыйсці чалавецкае грамадства, указала пераход да класавай барацьбы, да пачатку пролетарскай рэвалюцыі».

(З «Прамовы на III Усерасійскім з'ездзе РКСМ 2 кастрычніка 1920 года». Том XXV, стар. 387).

«Працоўныя прагнуць да ведаў, таму што яны неабходны ім для перамогі. Дзевяць дзесятых працоўных мас зразумелі, што веды з'яўляюцца арудзем у іх барацьбе за вызваленне, што іх няўдачы тлумачацца недахопам адукавання і што цяпер ад іх саміх залежыць зрабіць асвету сапраўды даступнай усім. Наша справа забяспечана тым, што масы самі ўзяліся за будаўніцтва новай соцыялістычнай Расіі. Яны вучацца на сваім уласным вопыце, на сваіх няўдачах і памылках, яны бачаць, наколькі асвета неабходна для пераможнага заканчэння той барацьбы, якую яны вядуць».

(З «Прамовы на I Усерасійскім з'ездзе па асвеце 28 жніўня 1918 года». Том XXIII, стар. 199).

«Як дзекабрысты абудзілі Герцэна, так Герцэн і яго «Колокол» дапамаглі абуджэнню разначынцаў, адукаваных прадстаўнікоў ліберальнай і дэмакратычнай буржуазіі, належаўшых не да дваранства, а да чыноўніцтва, мяшчанства, купецтва, сялянства. Папярэднікамі поўнага выцяснення дваран разначынцамі ў нашым вызваленчым руху быў яшчэ пры прыгонным праве В. Г. Белінскі. Яго славутае «Пісьмо да Гогаля», якое падводзіла вынік літаратурнай дзейнасці Белінскага, было адным з лепшых твораў бесцэнзурнага дэмакратычнага друку, што захавалі велізарнае, жывое значэнне і да гэтай пары.

Падзенне прыгоннага права выклікала паяўленне разначынца, як галоўнага, масавага дзеяча і вызваленчага руху наогул і дэмакратычнага, бесцэнзурнага друку ў прыватнасці. Пануючым напрамкам, адпавядаючым пункту погляду разначынца, стала народніцтва. Яно ніколі не магло, як грамадская плынь, адмежавацца ад лібералізма справа і ад анархізма злева. Але Чэрнышэўскі, які развіў услед за Герцэнам народніцкія погляды, зрабіў велізарны крок наперад супроць Герцэна. Чэрнышэўскі быў куды больш паслядоўным і баявым дэмакратам. Ад яго твораў вее духам класавай барацьбы. Ён рэзка праводзіў тую лінію выкрыцця здрадніцтваў лібералізма, якая дагэтуль ненавісна кадэтам і ліквідатарам. Ён быў надзвычай глыбокім крытыкам капіталізма, не гледзячы на свой утапічны соцыялізм».

(З артыкула «З мінулага рабочага друку ў Расіі». Том XVII, стар. 341).


«Ставячы лозунг «інтэрнацыянальнай культуры дэмакратызма і сусветнага рабочага руху», мы **з кожнай** нацыянальнай культуры бярэм **толькі** яе дэмакратычныя і яе соцыялістычныя элементы, бярэм іх **толькі і безумоўна** ў процівагу буржуазнай культуры, буржуазнаму нацыяналізму **кожнай** нацыі».

(З «Крытычных заметак па нацыянальнаму пытанню». Том XVII, стар. 137).

«Капіталізм душыў, падаўляў, разбіваў масу талентаў у асяроддзі рабочых і працоўных сялян. Таленты гэтыя гінулі пад гнётам галечы, жабрацтва, надругання над чалавечай асобай. Наш доўг цяпер умець знайсці гэтыя таленты і прыставіць іх да работы. Новыя члены партыі, уступіўшыя ў часе партыйнага тыдня, несумненна, у большасці сваёй нявопытныя і ў справе дзяржаўнага кіраўніцтва няўмелыя. Але гэтак-жа несумненна, што гэта — адданейшыя, найшчырэйшыя і найздольнейшыя людзі з тых грамадскіх слаёў, якія капіталізм штучна трымаў **унізу**, рабіў «ніжэйшымі» слаямі, не даваў ім узняцца ўгору. А сілы, свежасці, непасрэднасці, загартаванасці, шчырасці ў іх **больш**, чым у другіх.

Адсюль выцякае, што ўсе партыйныя арганізацыі павінны асобна абдумаць выкарыстанне гэтых новых членаў партыі. Трэба **смялей** даваць ім як можна больш рознастайную дзяржаўную работу, трэба хутчэй выпрабаваць іх практычна».

(З артыкула «Вынікі партыйнага тыдня ў Маскве і нашы задачы». Том XXIV, стар. 491—492).



Помните, любите, изучайте Ильича, нашего учителя, нашего вождя.
Боритесь и побеждайте врагов, внутренних и внешних, — по Ильичу.
Стройте новую жизнь, новый быт, новую культуру — по Ильичу.
Никогда не отказывайтесь от малого в работе, ибо из малого строится великое, — в этом один из важных заветов Ильича.
И. Сталин

Факсіміле пісьма таварыша І. В. Сталіна, змешчана ў «Рабочей газете» ў гадавіну смерці В. І. Леніна.



Сустрэча В. І. Леніна з І. В. Сталіным на першай канферэнцыі РСДРП у фінляндскім гор. Тамерфорсе. З карціны мастака І. А. Вацхвадзе.

ІНФАРМАЦЫЙНАЕ ПАВЕДАМЛЕННЕ АБ ЧАРГОВЫМ ПЛЕНУМЕ ЦК ВКП(б)

Гэтымі днямі адбыўся чарговы Пленум Цэнтральнага Камітэта ВКП(б).

Пленум разгледзеў пытанні Сесіі Вярхоўнага Совета СССР і прыняў адпаведныя рашэнні.

Пленум абмеркаваў пытанні „Аб памылках партарганізацый пры выключэнні комуністаў з партыі, аб фармальна-бюракратычных адносінах да апеляцый выключаных з ВКП(б) і аб мерах па устараненню гэтых недахопаў“ і прыняў адпаведную пастанову, публікуемую ніжэй.

Апрача таго, Пленум ЦК разгледзеў рад гаспадарчых пытанняў і прыняў адпаведныя рашэнні.

Пленум вызваліў тав. Постышэва П. П. са складу кандыдатаў у члены Палітбюро ЦК ВКП(б).

Пленум увёў у склад кандыдатаў у члены Палітбюро ЦК ВКП(б) сакратара Маскоўскага абкома ВКП(б) тав. Хрушчова Н. С. і ў склад Оргбюро ЦК ВКП(б)—тав. Мехліса Л. З.

Аб памылках партарганізацый пры выключэнні комуністаў з партыі, аб фармальна-бюракратычных адносінах да апеляцый выключаных з ВКП(б) і аб мерах па устараненню гэтых недахопаў

ПАСТАНОВА ПЛЕНУМА ЦК ВКП(б)

Пленум ЦК ВКП(б) лічыць неабходным звярнуць увагу партыйных арганізацый і іх кіраўнікоў на тое, што яны, праводзячы вялікую работу па ачышчэнню сваіх радоў ад трацкісцка-правых агентаў фашызма, дапускаюць у працэсе гэтай работы сур'ёзныя памылкі і скажэнні, якія перашкаджаюць справе ачышчэння партыі ад двурушнікаў, шпіёнаў, шкоднікаў. Наперакор неаднаразовым указанням і папярэджанням ЦК ВКП(б), партыйныя арганізацыі ў многіх выпадках падыходзяць зусім няправільна і злачынна-лёгкадумна да выключэння комуністаў з партыі.

ЦК ВКП(б) не раз патрабаваў ад партыйных арганізацый і іх кіраўнікоў уважлівага, індывідуальнага падыходу да членаў партыі пры рашэнні пытанняў аб выключэнні з партыі або аднаўленні няправільна выключаных з ВКП(б) у правах членаў партыі.

Пленум ЦК ВКП(б) у сваім рашэнні ад 5 сакавіка 1937 года па дакладу таварыша Сталіна «Аб недахопах партыйнай работы і мерах ліквідацыі трацкісцкіх і іншых двурушнікаў» указваў:

«Некаторыя нашы партыйныя кіраўнікі хвараюць адсутнасцю належнай увагі да людзей, да членаў партыі, да работнікаў. Больш таго, яны не вывучаюць работнікаў, не ведаюць, чым яны жывуць і як яны растуць, не ведаюць наогул сваіх кадраў. Іменна таму ў іх няма індывідуальнага падыходу да членаў партыі, да работнікаў партыі. А індывідуальны падыход складае галоўную справу ў нашай арганізацыйнай рабоце. І іменна таму, што ў іх няма індывідуальнага падыходу пры ацэнцы членаў партыі і партыйных работнікаў, яны звычайна дзейнічаюць наабум: або яны хваляць іх агулам, без меры, або яны збіваюць іх таксама агулам, без меры, выключаюць з партыі тысячамі і дзесяткамі тысяч. Некаторыя нашы партыйныя кіраўнікі наогул стараюцца мысліць дзесяткамі тысяч, не клапоцячыся аб «адзінках», аб асобных членах партыі, аб іх лёсе. Выключыць з партыі тысячы і дзесяткі тысяч людзей яны лічаць няважнай справай, уцяшаючы сябе тым, што партыя ў нас вялікая і дзесяткі тысяч выключаных не могуць што-небудзь змяніць у становішчы партыі. Але так могуць падыходзіць да членаў партыі толькі людзі, па сутнасці справы глыбока антыпартыйныя.

У рэзультаце такіх бяздушных адносін да людзей, членаў партыі і партыйных работнікаў штучна ствараецца незадаволенне і азлабленне ў адной частцы партыі.

Зразумела, што трацкісцкія двурушнікі лоўка падчапляюць такіх азлобленых таварышоў і ўмела цягнуць іх за сабой у балота трацкісцкага шкодніцтва».

У гэтым-жа рашэнні Пленума ЦК ВКП(б) сказана:

«Асудзіць практыку фармальных і бяздушна-бюракратычных адносін да пытання аб лёсе асобных членаў партыі, аб выключэнні з партыі членаў партыі або аб аднаўленні выключаных у правах членаў партыі.

Абавязаць партыйныя арганізацыі праяўляць максімум асцярожнасці і таварыскіх клопатаў пры рашэнні пытання аб выключэнні з партыі або аб аднаўленні выключаных у правах членаў партыі».

У пісьме ад 24 чэрвеня 1936 года «Аб памылках пры разглядзе апеляцый выключаных з партыі ў часе праверкі і абмену партыйных дакументаў» ЦК ВКП(б) указваў на несур'ёзныя, а ў радзе выпадкаў, бяздушна-чыноўніцкія адносіны партыйных органаў да разбору апеляцый выключаных з партыі:

«Наперакор указанням ЦК, — гаворыцца ў гэтым пісьме, — апеляцыі выключаных разглядаюцца вельмі марудна. Многія выключаныя месяцамі дабіваюцца разбору пададзеных імі апеляцый. Вялікая колькасць апеляцый разглядалася завочна, без усякай праверкі заяў апеліруючых, без забеспячэння апеліруючым магчымасці даць падрабязныя тлумачэнні па поваду прычын іх выключэння з партыі.

У радзе раённых партыйных арганізацый было дапушчана зусім нецярпімае сваволле ў адносінах да выключаных з партыі. Выключаных з партыі за ўтоенне сацыяльнага паходжання і за пасіўнасць, а не па матывах іх варожай дзейнасці супроць партыі і совецкай улады, аўтаматычна знімалі з работы, пазбаўлялі кватэр і т. п.

Такім чынам партыйныя кіраўнікі гэтых партарганізацый, не ўсвоіўшы па-сапраўднаму ўказанняў партыі аб большэвіцкай пільнасці, сваімі фармальна-бюракратычнымі адносінамі да разгляду апеляцый выключаных пры праверцы партыйных дакументаў ігралі на-руку ворагам партыі».

Як відаць, папярэджваючыя ўказанні мясцовым партыйным арганізацыям былі.

І ўсё-ж, не гледзячы на гэта, многія партарганізацыі і іх кіраўнікі прадаўжаюць фармальна і бяздушна-бюракратычна адносіцца да лёсу асобных членаў партыі.

Вядома не мала фактаў, калі партыйныя арганізацыі без усякай праверкі і, значыцца, неабгрунтавана выключаюць комуністаў з партыі, пазбаўляюць іх работы, нярэдка нават абвяшчаюць, без усякіх к таму падстаў, ворагамі народа, чыняць беззаконні і сваволле над членамі партыі.

Так, напрыклад: ЦК КП(б) **Азербайджана** на адным пасяджэнні 5 лістапада 1937 года механічна пацвердзіў выключэнне з партыі 279 чалавек; **Сталінградскі** абком 26 лістапада зацвердзіў выключэнне 69 чалавек; **Новасібірскі** абком 28 лістапада механічна пацвердзіў рашэнні райкомаў ВКП(б) аб выключэнні з партыі 72 чалавек; у **Орджанікідзеўскай** краявой партыйнай арганізацыі Парткалегія КПК пры ЦК ВКП(б) адмяніла, як няправільныя і зусім неабгрунтаваныя, рашэнні аб выключэнні з партыі 101 комуніста з 160 чалавек, падаўшых апеляцыі; па **Новасібірскай** партыйнай арганізацыі такім-жа чынам прышлося адмяніць 51 рашэнне з 80; па **Растоўскай** партарганізацыі адменены 43 рашэнні з 66; па **Сталінградскай** партарганізацыі — 58 з 103; па **Саратаўскай** — 80 са 134; па **Курскай** партарганізацыі — 56 з 92; па **Вінніцкай** — 164 з 337 і т. д.

У многіх раёнах Харкаўскай вобласці пад відам «пільнасці» маюць месца шматлікія факты незаконнага звальнення з работы і адмаўлення ў прадастаўленні работы выключаным з партыі і беспартыйным работнікам. У Змієўскім раёне ў кастрычніку і лістападзе 1937 года беспрычынна зняты з работы 36 настаўнікаў і намечана да звальнення яшчэ 42. У рэзультаце, у школах сёл Таранаўка, Замасцяжнае, Скрыпаеўка і іншых не выкладаюць гісторыю, Канстытуцыю СССР, рускую, украінскую і замежныя мовы.

У г. Зміове ў сярэдняй школе выкладала біялогію настаўніца Журко, 1904 года нараджэння, дачка калгасніка, маючая васьмігадовы педагагічны стаж, завочніца чацвертага курса пединстытута. У мясцовай газеце з'явілася заметка аб яе браце, які працуе педагогам у г. Ізюме, як аб нацыяналісту. Гэтага аказалася дастатковым для звальнення Журко з работы. У сувязі са звальненнем т. Журко было выказана палітычнае недавер'е да яе мужа і паднята пытанне таксама і аб яго звальненні. Пры праверцы-ж высветлілася, што заметка аб брату Журко аказалася паклёпніцкай і ён з работы не зніамаўся.

У г. Харкаве па справе адной арыштаванай трацкісткі Горскай органамі НКВД была дапрошана ў якасці сведкі работніца заўкома фабрыкі імя Цінякова Эйнгорн. Аб сваім выкліку ў НКВД яна падзялілася з начальнікам спецчасткі Семянковым, які неадкладна пасля гэтага паставіў на парткоме завода пытанне аб сувязях Эйнгорн з трацкісткай Горскай. У рэзультаце Эйнгорн была знята з работы ў заўкоме і звольнена. Муж сястры Эйнгорн, які працаваў у рэдакцыі мясцовай газеты, зволен за тое, што «не паведаміў аб сувязях сястры яго жонкі з трацкістамі».

Курскі абком ВКП(б) без усякай праверкі завочна выключыў з партыі і дабіўся арышту члена партыі старшыні заўкома Дзмітра-Таранаўскага цукровага завода Іванчэнкавай, прыпісаўшы ёй свядомую контррэволюцыйную падрыхтоўку выступлення беспартыйнага рабочага Кулінічэнка на перадвыбарчым сходзе ў Вярхоўны Совет СССР. Пры праверцы ўстаноўлена, што ўся «віна» Іванчэнкавай заключалася ў тым, што на перадвыбарчым сходзе беспартыйны рабочы Кулінічанка, пасля таго, як расказаў аб сваім жыцці, збіўся ў выступленні і забыўся назваць прозвішча кандыдата ў дэпутаты Вярхоўнага Совета.

У многіх раёнах Куйбышэўскай вобласці выключана з партыі вялікая колькасць комуністаў з матывіроўкай, што яны з'яўляюцца ворагамі народа. Між тым, органы НКВД не знаходзяць ніякіх падстаў для арышту гэтых выключаных з партыі. Напрыклад, Большэ-Чэрнігаўскі райком ВКП(б) выключыў з партыі і абвясціў ворагамі народа 50 чалавек з агульнай колькасці 210 комуністаў, якія састаяць у раённай партарганізацыі, у той час, як у адносінах 43 з гэтых выключаных органы НКВД не знайшлі ніякіх падстаў для арышту. У Парткалегію КПК пры ЦК ВКП(б) па Куйбышэўскай вобласці з'яўляюцца многія выключаныя райкомамі ВКП(б) як ворагі народа, з патрабаваннем або іх арыштаваць, або зняць з іх ганебнае кляймо.

ЦК ВКП(б) мае даныя аб тым, што такія факты маюць месца і ў іншых партарганізацыях.

Пленум ЦК ВКП(б) лічыць, што ўсе гэтыя і падобныя ім факты маюць распаўсюджанне ў партарганізацыях перш за ўсё таму, што сярод комуністаў існуюць, яшчэ не ўскрыты і не выкрыты **асобныя кар'ерысты-комуністы, якія стараюцца вызначыцца і вылучыцца на выключэннях з партыі, на рэпрэсіях супроць членаў партыі, якія стараюцца застрахаваць сябе ад магчымых абвінавачанняў у недахопе пільнасці шляхам прымянення агульных рэпрэсій супроць членаў партыі.**

Такі кар'ерыст-комуніст мяркуе, што раз на члена партыі падана заява, хаця-б няправільная або нават правакацыйная, ён, гэты член партыі, небяспечны для арганізацыі і ад яго трэба па-

(Працяг гл. на 3 стар.).

Першая сесія Вярхоўнага Совета СССР 1-га склікання

Прамова тав. В. М. МОЛАТАВА

Аб утварэнні ўрада СССР

(Калі старшынствуючы прадастаўляе слова таварышу Молатаву, усе прысутныя ў зале ўстаюць, бурна апладыруюць. Апладысменты пераходзяць у авацыю, авацыя працягваецца некалькі мінут. Нясуцца воклічы з месц: «Бліжэйшаму саратніку таварыша Сталіна — таварышу Молатаву — Ура!». Бурныя апладысменты, воклічы «Ура!»).

Таварышы дэпутаты! Вярхоўны Совет даручыў мне прадставіць на зацвярджэнне склад Совета Народных Камісараў. У гэтым сваім рашэнні Вярхоўны Совет прапанаваў улічыць крытычныя заўвагі, выказаныя дэпутатамі ў ходзе спрэчак па пытанню аб утварэнні ўрада. Зразумела, з гэтага і будуць зыходзіць мае прапановы.

Перш чым перайсці да складу Совета Народных Камісараў, мне прыйдзецца спыніцца на тых крытычных заўвагах, якія тут былі выказаны дэпутатамі Жданавым, Багіравым і Касіорам. Гэтыя таварышы ў сваіх прамовах спыніліся на рабоце раду наркаматаў, і я павінен сказаць, што з іх крытычнымі заўвагамі Совет Народных Камісараў цалкам згодзен.

Пачну з пытання аб некаторых баках работы Народнага Камісарыята Замежных Спраў. На што тут было ўказана? Тав. Жданаў адзначыў, што Вярхоўны Совет і ён, як прадстаўнік працоўных Ленінграда, поўнасцю падтрымліваюць праводзімую совецкім урадам знешнюю палітыку, якая нам забяспечвае мір, якая паспяхова абараняецца і практычна праводзіцца Народным Камісарыятам Замежных Спраў. Але ён указаў і на некаторыя моманты, якія нельга не лічыць ценязымі бакамі ў гэтай вобласці.

Вось, напрыклад, пытанне аб замежных консулах у Совецкім Саюзе.

Трэба прызнаць, што гэтым пытаннем у належнай меры мы не займаліся да апошняга часу. Між тым, гэтае пытанне заслугоўвае ўвагі, і, вядома, у першую чаргу ўвагі Народнага Камісарыята Замежных Спраў. Сапраўды, у Совецкім Саюзе аказаліся ў лішку замежныя консульствы ў раду дзяржаў, якія нічым не заслужылі асобага становішча і пераваргі ў адносінах да іншых дзяржаў. Некаторыя з замежных дзяржаў, і ў тым ліку з такіх, якія ніяк нельга прызнаць прыяцельскімі да Совецкага Саюза, мелі гэтых консульстваў значна больш, чым Совецкі Саюз меў у гэтых дзяржавах. Паўстае пытанне, на якой гэта падставе?

Правільна і тое, што некаторыя замежныя консулы займаліся ў нашай краіне недазволенымі справамі, займаліся варожымі, антысовецкімі справамі шпіёнскага і шкодніцкага характару. Далей цярпець такое становішча безумоўна нельга.

Для ўнясення поўнай яснасці ў гэтае пытанне я павінен паведаміць, што некаторыя меры ў гэтых адносінах ужо прыняты. Закрыта пара японскіх консульстваў, у Новасібірску і Одэсе. Закрыта таксама пара польскіх консульстваў, у Харкаве і Тбілісі. Закрыты 5 германскіх консульстваў: у Ленінградзе, Харкаве, Одэсе, Тбілісі і Владзівастоку. Да 15 студзеня гэта ўжо было ажыццёўлена. Належыць закрыццю і рад іншых консульстваў. Належыць закрыццю рад консульстваў Італіі, Ірана, Турцыі, Афганістана, Латвіі і іншых краін.

Заўвагі тав. Жданава адносна замежных консульстваў, дружна падтрыманыя ўсім Вярхоўным Советам, Совет Народных Камісараў поўнасцю ўлічыць і правядзе ўсе належныя меры ў гэтых адносінах у бліжэйшы-ж час. **(Апладысменты).**

Тут зроблены былі таксама заўвагі адносна нашых узаемаадносін з двума дзяржавамі, — з Японіяй і з Францыяй.

Перш за ўсё, наконт нашых узаемаадносін з Японіяй і наконт паводзін некаторых бесцэрамонных агентаў японскага ўрада і небезвядомага, але сапраўды марыянетачнага Манчжоу-Го.

Вы ведаеце, таварышы, што совецкаму ўраду прыходзілася не раз пратэставаць супроць некаторых недапушчальных дзеянняў з боку японскіх і манчжурскіх улад. Ніхто ў Совецкім Саюзе без абурэння не можа глядзець на тыя бесцэрамонныя прыёмы з боку япона-манчжурскіх улад, якія яны ўжываюць, напрыклад, цяпер у адносінах аднаго паштовага самалёта грамадзянскай авіяцыі на Далёкім Усходзе, заблудзіўшагася ў дарозе і выпадкова сеўшага на тэрыторыі Манчжоу-Го. Роўна месяц таму назад 19 снежня меў месца гэты факт, факт захвату нашага паштовага самалёта, захвату двух совецкіх людзей— лётчыка і яго памочніка — і захвату шматлікай паштовай карэспандэнцыі, якая была на гэтым самалёце. Але да гэтага часу мы не маем ніякіх паведамленняў па гэтаму поваду ад японскага ўрада, не гледзячы на неаднаразовыя запросы і ў То[кі]о і ў Манчжоу-Го.

Совецкі ўрад вымушан быў 16 студзеня паслаць накіраваную да японскага ўрада ноту пратэсту супроць недапушчальных і незаконных дзеянняў японаманчжурскіх улад. У гэтай ноце мы катэгарычна настойваем на неадкладным вызваленні затрыманых совецкіх грамадзян і на звароце самалёта і пошты, папярэджваючы японскі ўрад аб тым, каб ён не прымусіў нас стаць на шлях адказных рэпрэсалій. Мы разлічваем, што зможам поўнасцю забяспечыць інтарэсы Совецкага Саюза супроць такіх і ўсякіх іншых бесцэрамонных дзеянняў замежных дзяржаў. Мы можам запэўніць вас, таварышы, у тым, што ўсе тыя меры, якія патрабуюцца з нашага боку, мы сапраўды правядзем. **(Працяглыя апладысменты).**

Некалькі слоў аб нашых узаемаадносінах з Францыяй. Зноў-такі нельга не прызнаць грунтоўнасці заўваг тав. Жданава. Сапраўды, да сучаснага моманту, не гледзячы на наяўнасць прыязных адносін паміж Совецкім Саюзам і Французскай рэспублікай, на тэрыторыі Францыі знаходзяць сабе ўсялякі прытулак такія авантурысты і такія злачынныя арганізацыі, якія з'яўляюцца нічым іншым, як змяінымі гнёздамі тэрарыстаў і дыверсантаў, якія адкрыта займаюцца гэтымі сваімі варожымі антысовецкімі справамі на вачах і пад апекай французскіх улад. Вядома, гэта нельга апраўдаць правам прытулку для іншакраінцаў. Паўстае пытанне, каму патрэбна гэта заахвочванне ўсякага роду злачынцаў, рускага і нярускага буржуазнага паходжання, якія займаюцца антысовецкімі тэрарыстычнымі справамі на французскай тэрыторыі і адкрыта падрыхтоўваюць свае злачынныя справы супроць совецкіх дзеячоў, супроць совецкіх органаў? Чаму гэтых паноў так заахвочваюць ва Францыі і як гэта адпавядае прыязнаму совецка-французскаму пакту? Гэтым пытаннем безумоўна прыйдзецца заняцца нашаму Народнаму Камісарыяту Замежных Спраў.

Вярхоўны Совет не палічыў магчымым прайсці міма гэтых абураючых і накіраваных супроць Совецкага Саюза фактаў. Нельга не згадзіцца з тым, што ён меў да гэтага поўную падставу. Соўнарком улічыць зробленыя на Сесіі Вярхоўнага Совета заўвагі па гэтаму пытанню і дасць адпаведныя ўказанні Народнаму Камісарыяту Замежных Спраў.

Тут былі закрануты таксама і пытанні, якія адносяцца да работы іншых Народных Камісарыятаў.

Тав. Жданаў адзначыў недахопы ў рабоце Народнага Камісарыята Воднага Транспарта. Сапраўды, часу прайшло нямала для таго, каб Наркамвод прыняў меры і зрушыўся з мелі, на якую ён сеў яшчэ ў пазамінулым мелкаводным годзе. Як Соўнарком ні дапамагаў Народнаму Камісарыяту Воднага Транспарта злезці з гэтай мелі, пакуль нам не ўдалося гэтага дабіцца. Кіраўніцтва Наркамвода празмерна марудна раскачваецца і пакуль не забяспечвае належнага паляпшэння ў рабоце. Напомнім таварышам з Наркамвода, што хутка пачынаецца новая навігацыя, яна пачнецца ўсяго праз якіх-небудзь 2—3 месяцы. Гэта будзе апошняе выпрабаванне для цяперашніх кіраўнікоў Наркамвода. Яшчэ не позна, каб тав. Пахомаў, нарком воднага транспарта, выправіў становішча, заняўся па-сапраўднаму рамонтам судаў, разгарнуў рашучую барацьбу з аварыямі, па-сапраўднаму узяўся за ліквідацыю стратнасці воднага транспарта, а галоўнае—за падбор і выхаванне кадраў воднага транспарта. Кіраўніцтва Наркамвода атрымала тут сур'ёзнае папярэджанне, і калі яно быстра не выправіць сваю работу, яно павінна будзе наракаць на сябе. Таварышы воднікі, сярод якіх нямала добрых работнікаў і сапраўдных стаханаўцаў, павінны паказаць сваё ўменне выпраўляць недахопы і павінны ў 1938 годзе так падняць сваю работу, як гэта належыць перадавым транспартнікам і сапраўдным будаўнікам соцыялізма.

Больш рэзка тут былі падкрэслены недахопы трох агульнасаюзных органаў, а іменна: Наркамюста, Камітэта загатовак і Камітэта мастацтваў.

Нельга не прызнаць прамову тав. Багірава зусім аб'ектыўнай. Ён указаў у адносінах тав. Крыленка, наркома юстыцыі, не толькі на недахопы, але і на ста-

(Працяг на 4-й стар.)

Інфармацыйнае паведамленне

АБ СУМЕСНЫМ ПАСЯДЖЭННІ СОВЕТА САЮЗА І СОВЕТА НАЦЫЯНАЛЬНАСЦЕЙ 17 СТУДЗЕНЯ 1938 ГОДА

17 студзеня, у 2 гадзіны дня, у залі пасяджэнняў Совета Саюза, у Крэмлі, адбылося другое сумеснае пасяджэнне Совета Саюза і Совета Нацыянальнасцей.

Старшынствуе старшыня Совета Нацыянальнасцей **Н. М. Швернік.**

Вярхоўны Совет СССР прымае прапанову разглядзець на даным пасяджэнні першым пытаннем пункт 5 парадку дня сумеснага пасяджэння — аб аплаце дэпутатам выдаткаў, звязаных з выкананнем дэпутацкіх абавязкаў. Па прапанове дэпутата **П. Г. Маскатава** Вярхоўны Совет СССР прымае наступную пастанову:

1. Устанавіць для дэпутатаў Вярхоўнага Совета СССР узмяшчэнне выдаткаў, звязаных з выкананнем дэпутацкіх абавязкаў, штомесячна па 1 тысячы рублёў.

2. Для ўзмяшчэння выдаткаў дэпутатаў за перыяд Сесіі Вярхоўнага Совета СССР устанавіць сутачныя ў размеры 150 рублёў.

3. Устанавіць для дэпутатаў Вярхоўнага Совета СССР пастаянныя білеты на права бясплатнага праезду па ўсіх чыгуначных і водных шляхах СССР.

4. Прадугледзець па каштарысу Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР водпуск у распараджэнне як Старшыні і Намеснікаў Старшыні Совета Саюза, так і ў распараджэнне Старшыні і Намеснікаў старшыні Совета Нацыянальнасцей па 300 тысяч рублёў у год па кожнай палаце на выдаткі па зносінах з дэпутатамі і на прадстаўніцтва.

Вярхоўны Совет СССР пераходзіць да абмеркавання пункта 2 парадку дня сумеснага пасяджэння — выбрання Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР.

Ад Совета старэйшын Совета Саюза і ад Совета старэйшын Совета Нацыянальнасцей выступае з прапановай дэпутат С. В. Касіор.

Выклаўшы меркаванні, якія па думцы Советаў старэйшын павінны быць пакладзены ў аснову выбрання Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР, дэпутат Касіор агалашае кандыдатаў, вылучаемых Советамі старэйшын у Прэзідыум Вярхоўнага Совета. Персанальным галасаваннем кожнага кандыдата Вярхоўны Совет выбірае Прэзідыум Вярхоўнага Совета СССР у наступным складзе:

СТАРШЫНЯ ПРЭЗІДЫУМА ВЯРХОЎНАГА СОВЕТА СССР

1. **Калінін Міхаіл Іванавіч,** дэпутат ад Ленінградскай гарадской акругі, РСФСР.

НАМЕСНІКІ СТАРШЫНІ ПРЭЗІДЫУМА ВЯРХОЎНАГА СОВЕТА СССР

2. **Хахлоў Іван Сяргеевіч,** дэпутат ад Маскоўскай сельскай акругі, РСФСР.
3. **Петроўскі Грыгорый Іванавіч,** дэпутат ад Днепрапетроўскай акругі, УССР.
4. **Наталевіч Нікіфар Якаўлевіч,** дэпутат ад Слуцкай акругі, БССР.
5. **Касумаў Мір Башыр Фатах оглы,** дэпутат ад Сабір-Абадскай акругі, Азербайджанская ССР.
6. **Махарадзе Філіп Еўсеевіч,** дэпутат ад Самтрэдскай акругі, Грузінская ССР.
7. **Папян Мацак Петросавіч,** дэпутат ад Сцепанаванскай акругі, Армянская ССР.
8. **Бабаеў Хівалі,** дэпутат ад Теджэнскай акругі, Туркменская ССР.
9. **Ахунбабаеў Юлдаш,** дэпутат ад Андзіжанскай акругі, Узбекская ССР.
10. **Шагадаеў Мінавар,** дэпутат ад Гармскай акругі, Таджыкская ССР.
11. **Умурзакаў Нурбала,** дэпутат ад Чымкенцкай акругі, Казахская ССР.
12. **Саліхаў Мурат,** дэпутат ад Ошскай акругі, Кіргізская ССР.

САКРАТАР ПРЭЗІДЫУМА ВЯРХОЎНАГА СОВЕТА СССР

13. **Горкін Аляксандр Фёдаравіч,** дэпутат ад Канашскай акругі, Чувашская АССР.

ЧЛЕНЫ ПРЭЗІДЫУМА ВЯРХОЎНАГА СОВЕТА ССР

14. **Багіраў Мір Джафар,** дэпутат ад Бакінскай-Сталінскай акругі, Азербайджанская ССР.
15. **Берыя Лаўрэнцій Паўлавіч,** дэпутат ад Тбіліскай-Сталінскай акругі, Грузінская ССР.
16. **Блюхер Васілій Канстанцінавіч,** дэпутат ад Варашылаўскай акругі, Далёка-Ўсходні край.
17. **Будзённы Сямён Міхайлавіч,** дэпутат ад Шэпетоўскай акругі, УССР.
18. **Волкаў Аляксей Аляксеевіч,** дэпутат ад Гомельскай гарадской акругі, БССР.
19. **Дзінмухаметаў Галей,** дэпутат ад Нова-Шэшмінскай акругі, Татарская АССР.
20. **Жданаў Андрэй Аляксандравіч,** дэпутат ад Валадарскай акругі, г. Ленінград.
21. **Кагановіч Юлій Майсеевіч,** дэпутат ад Горкаўскай-Сталінскай акругі, Горкаўская вобласць.
22. **Косараў Аляксандр Васільевіч,** дэпутат ад Орджанікідзеўскай акругі, УССР.
23. **Крупская Надзежда Канстанцінаўна,** дэпутат ад Серпухоўскай акругі, Маскоўская вобласць.
24. **Маленкоў Георгій Максіміліянавіч,** дэпутат ад Клінскай акругі, Маскоўская вобласць.
25. **Маскатаў Пётр Георгіевіч,** дэпутат ад Шахцінскай акругі, Растоўская вобласць.
26. **Нікалаева Клаўдзія Іванаўна,** дэпутат ад Кашынскай акругі, Калінінская вобласць.
27. **Петроўскі Аляксей Нікалаевіч,** дэпутат ад Краснагвардзейскай акругі, г. Ленінград.
28. **Сідараў Іван Іванавіч,** дэпутат ад Окцябрскай акругі, г. Масква.
29. **Сталін Іосіф Вісарыёнавіч,** дэпутат ад Сталінскай акругі, г. Масква.
30. **Тахтараў Адзільгірэй,** дэпутат ад Махач-Калінскай гарадской акругі, Дагестанская АССР.
31. **Тімашэнка Сямён Канстанцінавіч,** дэпутат ад Харкаўскай сельскай акругі, УССР.
32. **Уграў Іляксандр Іванавіч,** дэпутат ад Смольнінскай акругі, г. Ленінград.
33. **Федзько Іван Фёдаравіч,** дэпутат ад Жытомірскай акругі, УССР.
34. **Хрушчоў Нікіта Сяргеевіч,** дэпутат ад Краснапрэсненскай акругі, г. Масква.
35. **Ібрагімаў Рахім Кірэевіч,** дэпутат ад Мелеузаўскай акругі, Башкірская АССР.
36. **Шкіратаў Матвей Фёдаравіч,** дэпутат ад Тульска-Разанскай акругі, РСФСР.
37. **Юсупаў Усман,** дэпутат ад Ташкенцкай-Сталінскай акругі, Узбекская ССР.

Пасля перапынку Вярхоўны Совет СССР пераходзіць да разгляду 3 пункта парадку дня сумеснага пасяджэння — утварэнне Ўрада СССР — Совета Народных Камісараў СССР.

Старшынствуючы Старшыня Совета Нацыянальнасцей **Н. М. Швернік** агалашае заяву Старшыні Совета Народных Камісараў СССР дэпутата В. М. Молатава.

«Старшыні сумеснага пасяджэння Совета Саюза і Совета Нацыянальнасцей Вярхоўнага Совета СССР — тав. Шверніку.

У адпаведнасці з арт. 70 Канстытуцыі СССР і ў сувязі з тым, што пытанне аб утварэнні Ўрада СССР пастаўлена на разгляд Вярхоўнага Совета СССР, Совет Народных Камісараў лічыць свае абавязкі вычарпанымі, і злагае свае поўнамоцтвы перад Вярхоўным Советам.

Совет Народных Камісараў СССР просіць Вас давесці аб гэтым да ведама Вярхоўнага Совета Саюза Совецкіх Соцыялістычных Рэспублік.

Старшыня Совета Народных Камісараў СССР — В. МОЛАТАЎ.

17 студзеня 1938 года».

Вярхоўны Совет пераходзіць да абмеркавання заявы Старшыні Совета Народных Камісараў СССР.

Выступаўшыя ў спрэчках дэпутаты **А. А. Жданаў, М. Д. Багіраў, С. В. Касіор** падвергні крытыцы дзейнасць асобных наркаматаў і камітэтаў Совета Народных Камісараў (Народны Камісарыят Замежных Спраў, Народны Камісарыят Воднага Транспарта, Народны Камісарыят Юстыцыі, Камітэт па справах мастацтваў і Камітэт загатовак).

Па прапанове дэпутата **П. І. Шпілявога,** Вярхоўны Совет прымае наступную пастанову:

«Вярхоўны Совет СССР выказвае давер'е Совету Народных Камісараў СССР і даручае старшыні Совета Народных Камісараў СССР таварышу Молатаву Вячаславу Міхайлавічу прадставіць прапановы аб складзе Ўрада, улічыўшы пры гэтым крытычныя заўвагі дэпутатаў, выказаныя ў ходзе спрэчак».

На гэтым другое сумеснае пасяджэнне Совета Саюза і Совета Нацыянальнасцей закрываецца.

АБ ПАМЫЛКАХ ПАРТАРГАНІЗАЦЫЙ ПРЫ ВЫКЛЮЧЭННІ КОМУНІСТАЎ З ПАРТЫІ, АБ ФАРМАЛЬНА-БЮРАКРАТЫЧНЫХ АДНОСІНАХ ДА АПЕЛЯЦЫЙ ВЫКЛЮЧАНЫХ З ВКП(б) І АБ МЕРАХ ПА ЎСТАРАНЕННЮ ГЭТЫХ НЕДАХОПАЎ

ПАСТАНОВА ПЛЕНУМА ЦК ВКП(б)

(ПРАЦЯГ)

збавіцца пахутчэй, каб застрахаваць сябе, як пільнага. Таму ён лічыць лішнім аб'ектыўна разбірацца ў прад'яўленых комуністу абвінавачаннях і загадзя прадрашае неабходнасць яго выключэння з партыі.

Такі кар'ерыст-комуніст, жадаючы выслужыцца, без усякага разбору разводзіць паніку наконт ворагаў народа і з лёгкасцю крычыць на партсходах аб выключэнні членаў партыі з партыі па якой-небудзь фармальнай падставе, або зусім без падставы. Партыйныя-ж арганізацыі нярэдка ідуць на паваду ў такіх крыкуноў-кар'ерыстаў.

Такі кар'ерыст-комуніст абыякава адносіцца да лёсу членаў партыі і гатоў заведама няправільна выключыць дзесяткі комуністаў з партыі для таго, каб самаму выглядаць пільным. Ён гатоў па малаважных учынках выключыць членаў партыі з партыі з тым, каб прыпісаць сабе «заслугі» ў выкрыцці ворагаў, а, калі вышэйстаячыя партыйныя органы аднаўляюць няправільна выключаных з партыі, ён ні мала не збянтэжваецца, становіцца ў позу чалавека, задаволенага тым, што ён ва ўсякім выпадку перастрахаваўся наконт «пільнасці».

Партыйныя арганізацыі і іх кіраўнікі замест таго, каб сарваць маску фальшывай пільнасці з такіх «комуністаў» і вывесці іх на чыстую ваду, самі нярэдка ствараюць ім арэол пільных барацьбітоў за чыстату радоў партыі.

Пара выкрыць такіх, з дазволу сказаць, комуністаў і закляйміць іх, як кар'ерыстаў, якія стараюцца выслужыцца на выключэннях з партыі, стараюцца перастрахавацца пры дапамозе рэпрэсій супроць членаў партыі.

Вядома, далей, нямала фактаў, калі замаскіраваныя ворагі народа, шкоднікі-двурушнікі ў правакацыйных мэтах арганізуюць падачу паклёпніцкіх заяў на членаў партыі і пад выглядам «разгортвання пільнасці» дабіваюцца выключэння з радоў ВКП(б) чэсных і адданых комуністаў, адводзячы тым самым ад сябе ўдар і захоўваючы сябе ў радах партыі.

Выкрыты вораг народа, былы заг. Акпо Растоўскага абкома ВКП(б) Шацкі і яго саўдзельнікі, карыстаючыся палітычнай блізарукасцю кіраўнікоў Растоўскага абкома ВКП(б), выключалі з партыі чэсных комуністаў, выносілі заведама няправільныя спагнанні работнікам, усяляк азлаблялі комуністаў, робячы ў той-жа час усё магчымае, каб захаваць у партыі свае контррэвалюцыйныя кадры.

У тым-жа Растове, былы заг. аддзелам школ Растоўскага абкома ВКП(б) вораг народа Шэстова па заданню контррэвалюцыйнай арганізацыі правяла ў партыйнай арганізацыі Растоўскага педагагічнага інстытута выключэнне з партыі каля 30 чэсных комуністаў.

Былы сакратар Кіеўскага абкома КП(б)У, вораг народа Кудраўцаў на партыйных сходах нязменна звяртаўся да выступаўшых комуністаў з правакацыйным пытаннем: «А вы напісалі хоць на каго-небудзь заяву?». У рэзультаце гэтай правакацыі ў Кіеве былі паданы палітычна кампраметуючыя заявы амаль на палову членаў гарадской партарганізацыі, прычым большасць заяў аказалася яўна няправільнай і нават правакацыйнай.

Выкрытае зараз варожае кіраўніцтва Барыкаднага райкома ВКП(б) гор. Сталінграда правакацыйна выключыла з партыі і дабілася арышту члена партыі з 1917 года Махнаткіна, былога чырвонага партызана, начальніка аднаго з буйнейшых цэхаў завода «Барыкады» за «антысовецкія размовы». Як высветлілася ў рэзультаце праверкі, гэтыя «антысовецкія размовы» выражаліся ў тым, што т. Махнаткін ў гутарцы з таварышамі выказваў незадаволенне па поваду бяздушных адносін сельсовета да дзяцей паўшага ў баю з белымі ў годы грамадзянскай вайны, камандзіра партызанскага атрада, у якім Махнаткін быў памочнікам камандзіра. Тав. Махнаткін адноўлен у правах члена партыі толькі пасля ўмяшання КПК пры ЦК ВКП(б).

Такія факты правакацыйнай работы ворагаў партыі, якія прабраліся ў партыйны апарат, мелі месца таксама ў Варонежскай, Краснадарскай, Чэлябінскай і ў іншых партыйных арганізацыях.

Усе гэтыя факты паказваюць, што многія нашы партарганізацыі і іх кіраўнікі да гэтага часу не здолелі разгледзець і выкрыць **майстэрска замаскіраванага ворага, які стараецца крыкамі аб пільнасці замаскіраваць сваю варожасць і захавацца ў радах партыі — гэта па-першае, — і, па-другое, які імкнецца шляхам правядзення мер рэпрэсій, — перабіць нашы большэвіцкія кадры, пасеяць няўпэўненасць і лішнюю падазронасць у нашых радах.**

Такі замаскіраваны вораг — злейшы здраднік — звычайна галасней за ўсіх крычыць аб пільнасці, спяшаецца як мага больш «выкрыць» і ўсё гэта робіць з мэтай скрыць свае ўласныя злачынствы перад партыяй і адцягнуць увагу партыйнай арганізацыі ад выкрыцця сапраўдных ворагаў народа.

Такі замаскіраваны вораг — гнусны двурушнік — усяляк імкнецца стварыць у партарганізацыях абстаноўку лішняй падазронасці, пры якой кожнага члена партыі, выступіўшага ў абарону другога комуніста, абняслаўленага кім-небудзь, неадкладна абвінавачваюць у адсутнасці пільнасці і ў сувязях з ворагамі народа.

Такі замаскіраваны вораг — подлы правакатар — у тых выпадках, калі партарганізацыя пачынае правяраць пададзеную на комуніста заяву, усяляк стварае правакацыйную абстаноўку для гэтай праверкі, сее вакол комуніста атмасферу палітычнага недавер'я і тым самым, замест аб'ектыўнага разгляду справы, арганізуе на яго паток новых заяў.

Партыйныя арганізацыі і іх кіраўнікі замест таго, каб ускрыць і выкрыць правакацыйную работу такога замаскіраванага ворага, нярэдка ідуць у яго на паваду, ствараюць яму абстаноўку беспакаранасці за паклёп на чэсных комуністаў і самі становяцца на шлях масавых неабгрунтаваных выключэнняў з партыі, накладанняў спагнанняў і т. д. Больш таго, нават пасля выкрыцця ворагаў, якія прабраліся ў партыйны апарат і паклёпнічаюць на чэсных комуністаў, нашы партыйныя кіраўнікі часта не прымаюць мер да ліквідацыі вынікаў шкодніцтва ў партыйных арганізацыях у адносінах няправільных выключэнняў комуністаў з партыі.

Пара ўсім партыйным арганізацыям і іх кіраўнікам выкрыць і да канца **знішчыць замаскіраванага ворага,** які прабраўся ў нашы рады і стараецца фальшывымі крыкамі аб пільнасці скрыць сваю варожасць і захаваць сябе ў партыі, каб прадаўжаць у ёй сваю гнусную здрадніцкую работу.

Чым вытлумачыць, што нашы партыйныя арганізацыі да гэтага часу не выкрылі і не закляймілі не толькі кар'ерыстаў-комуністаў, якія стараюцца адзначыцца і вылучыцца на выключэннях з партыі, але і замаскіраваных ворагаў унутры партыі, якія стараюцца крыкамі аб пільнасці скрыць сваю варожасць і захавацца ў партыі, стараюцца шляхам правядзення мер рэпрэсій перабіць нашы большэвіцкія кадры і пасеяць залішнюю падазронасць у нашых радах?

Тлумачыцца гэта злачынна-лёгкадумнымі адносінамі да лёсу членаў партыі.

Усім вядома, што многія нашы партыйныя кіраўнікі аказаліся **палітычна-блізарукімі** дзялягамі, дазволілі ворагам народа і кар'ерыстам абысці сябе і лёгкадумна аддалі на водкуп другарадным работнікам вырашэнне пытанняў, якія датычаць лёсу членаў партыі, злачынна ўхіліўшыся ад кіраўніцтва гэтай справай.

Абкомы, крайкомы, ЦК нацкомпартый і іх кіраўнікі не толькі не выпраўляюць антыпартыйную, чужую большэвізму практыку ў справе выключэння комуністаў з партыі, але часта самі сваім няправільным кіраўніцтвам насаджаюць фармальныя і бяздушна-бюракратычныя адносіны да членаў партыі і тым самым ствараюць спрыяючую абстаноўку для кар'ерыстаў-комуністаў і замаскіраваных ворагаў партыі.

Не было ні аднаго выпадку, каб абкомы, крайкомы, ЦК нацкомпартый, разабраўшыся ў справе, асудзілі практыку агульнага, валавога падыходу да членаў партыі, прыцягнулі да адказнасці кіраўнікоў мясцовых партыйных арганізацый за неабгрунтаванае і няправільнае выключэнне комуністаў з партыі.

Кіраўнікі партыйных арганізацый наіўна лічаць, што выпраўленне памылак у адносінах няправільнага выключаных можа падарваць аўтарытэт партыі і пашкодзіць справе выкрыцця ворагаў народа, не разумеючы, што кожны выпадак няправільнага выключэння з партыі — на-руку ворагам партыі.

У многіх абласных і краявых арганізацыях ляжыць без усякага руху вялікая колькасць неразгледжаных апеляцый. У Растоўскай вобласці не разгледжана больш 2.500 апеляцый, у Краснадарскім краі — 2.000, Смаленскай вобласці — 2.300, Варонежскай вобласці—1.200, Саратаўскай вобласці — 500 і т. д.

Абкомы, крайкомы, ЦК нацкомпартый, адмовіўшыся ад разгляду апеляцый выключаных, ператварылі, наперакор статуту партыі, рашэнні райкомаў і гаркомаў ВКП(б) па гэтаму пытанню ў безапеляцыйныя і канчатковыя рашэнні.

Усё гэта азначае, што абкомы, крайкомы, ЦК нацкомпартый па сутнасці ўхіліліся ад кіраўніцтва дзейнасцю мясцовых партыйных арганізацый у самым важным і вострым пытанні, у пытанні аб лёсе членаў партыі, прадаставіўшы рашэнне гэтага пытання самацёку, а часта і сваволлю.

Абкомы, крайкомы, ЦК нацкомпартый самі заахвочваюць практыку масавых, агульных выключэнняў з партыі тым, што пакідаюць беспакаранымі тых партыйных кіраўнікоў, якія дапускаюць сваволле ў адносінах комуністаў.

Пара пакончыць з чужымі для большэвікоў фармальнымі і бяздушна-бюракратычнымі адносінамі да людзей, да членаў партыі.

Пара зразумець, што:

«Партыя стала для члена партыі вельмі вялікай і сур'ёзнай справай і членства ў партыі або выключэнне з партыі — гэта вялікі пералом у жыцці чалавека».

Пара зразумець, што:

«Для радавых членаў партыі прабыванне ў партыі або выключэнне з партыі, — гэта пытанне жыцця і смерці». (Сталін).

Пара зразумець, што сутнасць большэвіцкай пільнасці заключаецца ў тым, каб умець выкрываць ворага, якім-бы хітрым і зваротлівым ён ні быў, у якую-б тогу ён ні апрануўся, а не ў тым, каб без разбору, або «на ўсякі выпадак» выключаць дзесяткамі і сотнямі з партыі ўсіх, хто трапіць пад руку.

Пара зразумець, што большэвіцкая пільнасць не толькі не выключае, а наадварот прадпалагае ўменне праяўляць максімум асцярожнасці і таварыскіх клопатаў пры рашэннях пытанняў аб выключэнні з партыі або аб аднаўленні выключаных у правах членаў партыі.

Пленум ЦК ВКП(б) патрабуе ад усіх партыйных арганізацый і іх кіраўнікоў усямернага павышэння большэвіцкай пільнасці партыйных мас, выкрыцця і выкарчоўвання да канца ўсіх вольных і нявольных ворагаў партыі.

Пленум ЦК ВКП(б) лічыць важнейшай умовай паспяховага вырашэння гэтай задачы — ліквідацыю без астатку антыпартыйнай практыкі агульнага, неіндывідуальнага, валавога падыходу да людзей, да членаў партыі.

Пленум ЦК ВКП(б) **пастанаўляе:**

1. Абавязаць абкомы, крайкомы, ЦК нацкомпартый і ўсе партыйныя арганізацыі рашуча пакончыць з масавымі, агульнымі выключэннямі з партыі і ўстанавіць на справе індывідуальны, дыферэнцыяваны падыход пры вырашэнні пытанняў аб выключэнні з партыі або аб аднаўленні выключаных у правах членаў партыі.

2. Абавязаць абкомы, крайкомы, ЦК нацкомпартый знімаць з партыйных пастоў і прыцягваць да партыйнай адказнасці тых партыйных кіраўнікоў, якія не выконваюць дырэктыў ЦК ВКП(б), выключаюць з партыі членаў і кандыдатаў ВКП(б) без стараннай праверкі ўсіх матэрыялаў і дапускаюць сваволле ў адносінах да членаў партыі.

3. Прапанаваць абкомам, крайкомам, ЦК нацкомпартый і парткалегіям КПК пры ЦК ВКП(б) ў трохмесячны тэрмін закончыць разгляд апеляцый усіх выключаных з партыі.

4. Абавязаць усе партыйныя камітэты ў сваіх пастановах аб выключэнні комуністаў з партыі ясна і дакладна выкладаць матывы, паслужыўшыя падставай для выключэння, каб вышэйстаячыя партыйныя органы мелі магчымасць праверыць правільнасць гэтых пастаноў, а кожную такую пастанову райкома, гаркома, абкома або ЦК нацкомпартый абавязкова публікаваць у друку.

5. Устанавіць, што партыйныя органы, аднаўляючы ў правах членаў партыі, няправільна выключаных мясцовымі партарганізацыямі, абавязаны ў сваіх пастановах дакладна ўказваць які райком, гарком ВКП(б) павінен выдаць аднаўленаму ў партыі партыйныя дакументы.

6. Абавязаць райкомы, гаркомы партыі неадкладна выдаваць партыйныя дакументы адноўленым ў партыі, прыцягваць іх да ўдзелу ў партыйнай рабоце і растлумачваць усім членам пярвічных партарганізацый, што яны адказваюць за большэвіцкае выхаванне адноўленых у радах ВКП(б).

7. Абавязаць партыйныя арганізацыі прыцягваць да партыйнай адказнасці асоб, вінаватых у паклёпе на членаў партыі, поўнасцю рэабілітаваць гэтых членаў партыі і публікаваць у друку свае пастановы ў тых выпадках, калі папярэдне ў друку былі змешчаны дыскрэдытуючыя члена партыі матэрыялы.

8. Забараніць партарганізацыям заносіць ва ўчотную картку комуніста факт выключэння яго з партыі да разгляду апеляцыйнай скаргі і высвятлення канчатковага рашэння аб выключэнні.

9. Забараніць няправільную, шкодную практыку, калі выключаных з ВКП(б) неадкладна знімаюць з займаемай імі пасады.

Устанавіць, што ва ўсіх выпадках, калі аказваецца неабходным, у сувязі з выключэннем з ВКП(б), аслабаніць работніка ад займаемай пасады, гэта аслабаненне можна рабіць толькі пасля прадастаўлення яму другой работы.

10. Абавязаць абкомы, крайкомы, ЦК нацкомпартый не пазней чым да 15 лютага 1938 года забяспечыць праз адпаведныя совецкія і гаспадарчыя органы паступленне выключаных з ВКП(б) на работу і надалей не дапускаць такога становішча, каб выключаныя з ВКП(б) аставаліся пазбаўленымі работы.

ПЕРШАЯ СЕСІЯ ВЯРХОЎНАГА СОВЕТА СССР 1-га СКЛІКАННЯ

Прамова Старшыні СНК СССР дэпутата В. М. МОЛАТАВА

(Дэпутаты наладжваюць доўгую авацыю Старшыні Совета Народных Камісараў СССР таварышу Молатаву. Усе ўстаюць. Раздаюцца воклічы: «Старшыні Соўнаркома т. Молатаву — ура!» Бурныя апладысменты. Воклічы: «Ура!»).

Таварышы, мы абмяркоўваем зараз вялікае пытанне, паколькі справа датычыць нашай Канстытуцыі, нашага асноўнага закона. Прадстаўленыя на ваша зацвярджэнне рашэнні Цэнтральнага Выканаўчага Камітэта і Совета Народных Камісараў аб некаторых зменах і дадатках да асобных артыкулаў Канстытуцыі датычаць, галоўным чынам, арганізацыйна-адміністрацыйных пытанняў, але яны ўносяць змены ў адміністрацыйны падзел унутры некалькіх саюзных рэспублік, датычаць агульнасаюзнага дзяржаўнага апарата і закранаюць жыццёвыя інтарэсы народаў Саюза.

У дакладзе тав. Горкіна і ў выступленнях прадстаўнікоў рэспублік ужо дастаткова асветлены пытанні, якія датычаць адміністрацыйнага падзелу і ўтварэння раду новых абласцей у РСФСР, Украіне, Узбекістане, Казахстане і Беларусі. Я спынюся на пытаннях, звязаных з работай агульнасаюзных органаў і з утварэннем новых агульнасаюзных наркаматаў.

Па першай Канстытуцыі Саюза, прынятай у 1924 годзе, у нас было створана 12 наркаматаў і Дзяржаўная Планавая Камісія. З таго часу многае змянілася ў жыцці краіны, размах дзяржаўнай работы намнога павялічыўся. Прыняўшы рашэнні, якія прадстаўлены цяпер на зацвярджэнне Вярхоўнага Совета, мы будзем мець у складзе Совета Народных Камісараў кіраўнікоў 26 наркаматаў, камітэтаў і пастаянных камісій, уключаючы Дзяржплан і Камісію Совецкага Кантроля. Апрача таго, пры Совеце Народных Камісараў існуе яшчэ 9 агульнадзяржаўных арганізацый, якія непасрэдна яму падпарадкаваны. Ва ўсім гэтым знайшлі свой адбітак не толькі велізарны рост народнай гаспадаркі і культурнага будаўніцтва, але таксама і рост задач ваеннай абароны краіны і адпавядаючая ўсяму гэтаму патрэбнасць большай дыферэнцыяцыі ў дзяржаўным кіраўніцтве, немінуча патрабуючая новых арганізацыйных форм.

Наколькі хутка расце наша гаспадарка і наколькі расшыраюцца нашы задачы ў гэтых адносінах, відаць хоць-бы з наступнага. Прайшло крыху больш года з часу зацвярджэння нашай Канстытуцыі VIII Усесаюзным з'ездам Советаў, а мы ўжо стаім перад неабходнасцю правядзення раду новых арганізацыйна-адміністратыўных мер як у саюзных рэспубліках, так і ў агульнасаюзным дзяржаўным апараце.

Усім вядома, які вялікі шлях прайшла за гэтыя годы наша індустрыя. У асаблівасці гэта адносіцца да цяжкай прамысловасці, якая ішла наперадзе ўсіх іншых галін народнай гаспадаркі. У выніку гэтага Наркамцяжпром, да вылучэння з яго машынабудаўніцтва, зрабіўся непамерна вялікай арганізацыяй з велізарнай колькасцю хутка развіваючыхся галін індустрыі. Нават цяпер, калі з Наркамцяжпрома ўжо выдзелена машынабудаўніцтва і створан Народны камісарыят машынабудаўніцтва, нават цяпер Наркамцяжпром — самы буйны прамысловы наркамат, наркамат, які дае каласальную колькасць і пры тым вельмі разнастайнай прадукцыі.

Нельга не згадзіцца з тым, што быстра растучае машынабудаўніцтва, у далейшым паскораным развіцці якога так зацікаўлены ўсе галіны народнай гаспадаркі, можна ў цяперашніх умовах правільна арганізаваць толькі пры дапамозе спецыяльнага наркамата.

За гэта гавораць наступныя лічбы. Калі ўзяць толькі перыяд двух пяцігодак — першай і другой пяцігодкі, — то толькі за гэты час, гэта значыць з 1928 года, машынабудаўніцтва зрасла ў Совецкім Саюзе ў 13,5 раза. А вы ведаеце, што патрэбы тэхнічнай рэканструкцыі яшчэ далёка не задаволены, што гэтыя патрэбы прадаўжаюць быстра расці. Па сутнасці, мы маем ужо два буйныя камісарыяты машынабудаўнічага тыпу. Перш за ўсё, трэба сказаць аб Народным камісарыяце абароннай прамысловасці, — гэта таксама, галоўным чынам, машынабудаўнічы камісарыят. Ён створан яшчэ пры прыняцці нашай Канстытуцыі, крыху больш, чым год таму назад, але ён ужо нагружан работай, так сказаць, да адказу. Ён дае патрэбныя машыны і абсталяванне для Чырвонай Арміі і флота і вырабляе нямалую колькасць другой, пераважна машынабудаўнічай, прадукцыі. Нам прышлося, аднак, стварыць спецыяльны Наркамат машынабудаўніцтва, так як нашы патрэбы ў тэхніцы, у машынах, у станках неабмежаваны. Напомню яшчэ, што і другія агульнасаюзныя і саюзна-рэспубліканскія наркаматы, а таксама наркаматы мясцовай прамысловасці вырабляюць нямалую колькасць машын і рознага абсталявання. Вядучае месца ў правядзенні далейшай тэхнічнай рэканструкцыі ў нашай краіне належыць цяпер Наркаммашу, створанаму некалькі месяцаў таму назад. Мы думаем, што Вярхоўны Совет адобрыць рашэнне аб стварэнні Наркаммаша. **(Апладысменты).**

Другі наркамат, аб якім ідзе гутарка ў прапановах, прадстаўленых на зацвярджэнне Вярхоўнага Совета, — Народны камісарыят загатовак.

Ужо ў цяперашнім выглядзе Камітэт сельскагаспадарчых загатовак пры СНК Саюза ССР — арганізацыя наркамацкага тыпу ў поўным сэнсе гэтага слова. У яго ёсць свае рэспубліканскія органы, краявыя і абласныя, а таксама і раённыя органы. На справе, гэта вялікі агульнасаюзны наркамат, якому, як вы ведаеце, работы хапае.

Рост задач у галіне загатовак звязан з удымам нашай сельскай гаспадаркі. Возьмем факты, якія адносяцца да росту сельскагаспадарчых загатовак за перыяд першай і другой пяцігодак, дакладней кажучы, за апошнія дзевяць год. За гэты перыяд загатоўкі зярна выраслі ў 2,5 раза; загатоўкі як цукровых буракоў, так і бульбы, павялічыліся ў два разы; загатоўкі бавоўны выраслі ў тры разы.

Цяпер, калі нашы ўраджаі пачалі хутка ісці ўверх, так як калгасны лад прыносіць ужо свае першыя спелыя плады, калі калгасы і соўгасы сталі ўжо на ногі, яны пакажуць сябе па-сапраўднаму ў росце ўсёй сельскагаспадарчай, у тым ліку жывёлагадоўчай прадукцыі. **(Апладысменты).**

Калгасы пачалі ўжо паспяхова ажыццяўляць вялікую задачу ўтварэння заможнага жыцця калгаснікаў. Моцныя калгасы і заможныя калгаснікі — быстры рост гэтага роду фактаў ідзе на нашых вачах. Такія калгасы здолеюць яшчэ лепш забяспечыць і дзяржаўныя патрэбы. Загатоўкі асноўных прадуктаў, якімі снабжаецца насельніцтва, якімі снабжаецца наша прамысловасць, якія патрэбны для многіх важнейшых патрэбнасцяў дзяржавы, — гэта такая справа, якая з кожным днём расце, становіцца ўсё больш сур'ёзнай. Арганізацыя справы загатовак на велізарнай тэрыторыі Саюза — складаная, вялікая справа. У гэтай справе ў нас яшчэ нямала буйных недахопаў. Хутчэйшае паляпшэнне справы арганізацыі загатовак у інтарэсах усёй дзяржавы і ў інтарэсах самой сельскай гаспадаркі, у інтарэсах калгасаў і калгаснікаў. Патрэбен наркамат, які-б валодаў гэту справу па-сапраўднаму, які палепшыў-бы свой мясцовы і цэнтральны апарат, які адказваў-бы за выкананне ўсёй справы загатовак. Гэтым тлумачыцца прапанова аб утварэнні Наркамзага.

Цяпер перайду да Дзяржаўнага банка.

Наш Дзяржаўны банк — гэта ўжо велізарная арганізацыя, роўнай якой ні ў адной дзяржаве няма ў гэтай галіне. Дзяржбанк мае ва ўсіх рэспубліках, краях і абласцях і амаль ва ўсіх раёнах свае ўстановы. Гэта — велізарны, разгалінаваны апарат нашай фінансавай сістэмы. Яго работа мае першаступеннае значэнне для развіцця народнай гаспадаркі, у асаблівасці для развіцця гандлю, для разгортвання таваразвароту, для снабжэння прамысловымі і харчовымі таварамі як горада, так і вёскі. Разам з ростам народнай гаспадаркі, разам з быстрым ростам патрэбнасцяў працоўных горада і вёскі, растуць і задачы Дзяржаўнага банка.

З некалькіх лічбаў мы можам бачыць, што адбылося за апошнія годы ў гэтай галіне.

Абароты Дзяржаўнага банка, калі браць толькі разлікі Дзяржбанка з народнай гаспадаркай, без унутрыбанкаўскіх разлікаў, выраслі за апошнія восем год у 13 раз. У 1928-29 годзе гэтыя разлікі Дзяржбанка з народнай гаспадаркай складалі 176 мільярдаў 662 мільёны 219 тысяч рублёў, а ў 1936 годзе яны складалі 2 трыльёны 115 мільярдаў 793 мільёны 886 тысяч рублёў.

Так вырас маштаб работы Дзяржаўнага банка.

Дзяржаўны банк лічыцца ў нас па традыцыі, па старыне, адной з арганізацый унутры Наркамата фінансаў, як быццам ён не мае самастойнага значэння, як быццам ён не з'яўляецца самастойнай крэдытна-фінансавай арганізацыяй. На справе гэта, вядома, далёка не так.

З другога боку, маштаб работы самога Народнага камісарыята фінансаў у велізарнай меры вырас і прадаўжае расці з кожным годам. Аб гэтым красамоўна гавораць даныя аб бюджэце нашай дзяржавы.

Калі ўзяць наш бюджэт у цэлым, гэта значыць уключаючы саюзны, разам з рэспубліканскімі і мясцовымі бюджэтамі, то атрымаем такую карціну. У 1928—1929 годзе гэты наш бюджэт быў 7,5 мільярда рублёў, а ў мінулым 1937 годзе ён ужо дасягнуў, па папярэдніх падліках, 101 мільярда рублёў, гэта значыць вырас за гэтыя 9 год у 13 раз. **(Апладысменты).**

Калі-б у нас не было такога хуткага росту дзяржаўнага, рэспубліканскага і мясцовага бюджэтаў, калі-б не было такога хуткага росту крэдытных абаротаў Дзяржаўнага банка, аб якіх мы зараз гаворым, у нас не маглі-б расці такімі хуткімі тэмпамі наша гаспадарка, наша культурнае будаўніцтва і не магла-б так хутка ўмацоўвацца абарона краіны, як гэта мы маем за ўсе гэтыя апошнія годы.

Дзяржаўны бюджэт і фінансавыя абароты Дзяржаўнага банка, як люстра адбіваюць тое, што ў нас адбываецца ў краіне Советаў, у простых лічбах, праўда, лічбах даволі салідных, даволі ўнушальных, даволі аўтарытэтных.

З гэтага трэба зрабіць, таварышы, некаторыя арганізацыйныя вывады. Мы, як быццам, не збіраемся скарачаць абароты Дзяржаўнага банка, а хочам іх далейшага росту. Мы, як быццам, не збіраемся скарачаць і наш бюджэт, а хочам ісці наперад па выпрабаванаму шляху, фінансуючы належным чынам узрастаючыя патрэбнасці дзяржавы, забяспечваючы яшчэ лепш растучыя патрэбнасці насельніцтва. Таму ўзнікае пытанне аб тым, каб надаць большую самастойнасць такой важнай фінансавай арганізацыі, як Дзяржаўны банк. Гэтым выклікаецца неабходнасць аддзяліць Дзяржаўны банк ад Народнага камісарыята фінансаў, надаць яму неабходную самастойнасць, а, значыць, і ўскласці на яго большую адказнасць за кіраўніцтва крэдытнай справай у Саюзе, падначаліўшы Дзяржбанк непасрэдна Соўнаркому і прадаставіўшы яго кіраўніку рашаючы голас у Совеце Народных Камісараў, на правах народнага камісара. Усё гэта дазваляе разлічваць на тое, што Вярхоўны Совет адобрыць нашу прапанову, як правільную, як своечасовую. **(Апладысменты).**

Затым, аб утварэнні яшчэ аднаго новага наркамата, аб утварэнні Народнага Камісарыята ваенна-марскога флота. Нельга не прызнаць, што гэта і вельмі важнае і вельмі наспеўшае пытанне. У нас цяпер 4 ваенна-марскія флоты: Балтыйскі, Чарнаморскі, Паўночны і Ціхаакіянскі. Здаецца, не мала для адной краіны, тым больш, што нашы марскія флоты маюць непасрэдныя адносіны і да некаторых акіянаў. Але па-сапраўднаму ўзяцца за будаўніцтва марскога флота мы змаглі толькі ў апошнія годы. І Балтыйскі, і Чарнаморскі, і Паўночны, і Ціхаакіянскі флоты пачалі ўжо расці так, як належыць для совецкай вялікай дзяржавы. Яны ўзмоцнена папаўняюцца новымі адзінкамі, пакуль больш дробнымі, а вось забудуем некаторыя новыя заводы,—якія пастараемся пабудаваць хутчэй!—і пачнем папаўняць нашы флоты хутчэй і пры тым магутнымі марскімі адзінкамі **(Бурныя апладысменты).**

Мы павінны лічыцца з тым, што краіна наша вялікая, што яна амываецца марамі на велізарным працягу, і гэта нам заўсёды напамінае аб тым, што флот у нас павінен быць моцны, магутны. **(Бурныя апладысменты).** Аб гэтым-жа нам напамінаюць і капіталістычныя дзяржавы тым, што за апошнія годы яны разгарнулі велізарнае ваенна-марское будаўніцтва. Мы не думаем аставацца роўнадушнымі да гэтага факта, тым больш, што імперыялістычныя дзяржавы ніяк не могуць дагаварыцца наконт хоць некаторых абмежаванняў гонкі ў ваенна-марскім будаўніцтве. Напрыклад, такая агрэсіўная дзяржава, як Японія, да гэтага часу адмаўляецца ад якога-небудзь удзелу ў абмежаванні марскіх узбраенняў. Да гэтага часу, не гледзячы на ўсякія міжнародныя канферэнцыі, — напомнім хоць-бы Лонданскую канферэнцыю 1936 года па пытаннях абмежавання марскіх узбраенняў, — для марскіх узбраенняў нашага далёкаўсходняга суседа — Японіі — абмежаванняў ніякіх няма. Ці не павінны мы ўлічыць гэты факт? Відавочна, вы скажаце, што гэту акалічнасць мы павінны як след улічыць у нашай рабоце. **(Апладысменты).**

Вось другі факт. Не гледзячы на фармальны ўдзел у Лонданскай канферэнцыі 1936 года, фашысцкая Італія таксама, па ўсякіх несур'ёзных матывах, адмовілася падпісаць якое-небудзь пагадненне з іншымі краінамі аб абмежаванні марскіх узбраенняў. А Італія-ж цяпер прэтэндуе на тое, каб бескантрольна гаспадарнічаць ва ўсім Міжземным моры, што не можа не закранаць буйнейшых інтарэсаў Совецкага Саюза. Ці не павінны мы ўлічыць і гэты факт у нашых рашэннях? **(Апладысменты).**

Гавораць, што фашысцкая Германія падпісала марское пагадненне, але мы яшчэ павінны паглядзець, чаго варты гэты подпіс. **(Смех, апладысменты).**

Ва ўсякім выпадку, усё гаворыць за тое, што нам трэба мець моцны ваенна-марскі флот. **(Апладысменты).**

Мы лічым так: галоўнае, каб быў моцны і магутны наш дзяржаўны карабль, а ён, як мы ведаем, моцны і ўсё больш мацнее. **(Бурныя апладысменты).** Наш совецкі лад магутны і хоча быць яшчэ магутнее, хоча быць непрыступным для ворагаў. **(Бурныя, працяжныя апладысменты).** З гэтага мы робім вывад, што нам патрэбна моцная Чырвоная Армія і нам патрэбен моцны ваенна-марскі флот. **(Працяжныя апладысменты).** У магутнай совецкай дзяржавы павінен быць адпавядаючы яе інтарэсам, дастойны нашай вялікай справы, марскі і акіянскі флот. **(Працяжныя апладысменты).**

Для таго, каб арганізаваць гэты флот з яго складаным тэхнічным аснашчэннем, з яго магутнай марской артылерыяй, з яго адпавядаючай дастоінству совецкага флота марской авіяцыяй **(бурныя апладысменты)** і для таго, каб выхаваць па-совецку шматлікія кадры кваліфікаваных маракоў і марскіх тэхнікаў, патрэбен новы наркамат, патрэбен Наркамат ваенна-марскога флота. **(Апладысменты).**

Іменна таму, што вырасла наша Чырвоная Армія, што і тут патрэбна велізарная штодзённая работа па далейшаму яе ўмацаванню, па яе далейшаму тэхнічнаму аснашчэнню, патрэбна значна лепшая работа па большэвіцкаму выхаванню адданых радзіме чырвонаармейцаў і камандзіраў, іменна таму, што кіраўніцтва ўсёй гэтай справай у Чырвонай Арміі мае перад сабой велізарныя задачы, а ваенна-марскі флот патрабуе спецыяльнай і пры тым узмоцненай да сябе ўвагі, мы лічым неабходным побач з Наркаматам абароны, мець Наркамат ваенна-марскога флота. **(Бурныя, працяжныя апладысменты).**

Наша задача—падняць яшчэ вышэй справу абароны сухапутных граніц і марскіх берагоў Совецкага Саюза. Спадзяемся, што нашы маракі з гонарам выканаюць сваю задачу, а Наркаммордфлот настойліва і нястомна будзе працаваць над стварэннем моцнага совецкага ваеннага марскога флота. **(Працяжныя апладысменты).**

Нарэшце, таварышы дэпутаты, яшчэ некалькі слоў з поваду адной з прапаноў, уносімых на ваша зацвярджэнне,—а іменна аб дапаўненні артыкула 49-га Канстытуцыі. Справа ідзе аб тым, каб дапоўніць гэты артыкул указаннем на права Прэзідыума Вярхоўнага Совета вырашаць пытанне аб увядзенні ваеннага становішча там, дзе гэта будзе патрэбна.

Вы ведаеце, што на Совецкі Саюз за апошнія годы ніхто звонку не нападаў, хапя і не было недахвату ў рознага роду правакацыях з боку імперыялістычных агрэсараў. Не было таму і патрэбнасці ва ўказаных мерапрыемствах і ў асаблівых рашэннях па гэтаму пытанню. І ўсё-ж мы павінны прадбачыць сёё-тое наконт магчымых ускладненняў. Таму, мне здаецца, прапанова, якая ўносіцца па гэтаму пытанню, вам зразумела і ўпаўне прыемлема. **(Дружныя апладысменты).**

Вось, таварышы, пытанні, на якіх я павінен быў спыніцца ў сувязі са зменамі ў Канстытуцыі.

У нас добрая совецкая Канстытуцыя, і таму народ назваў яе Сталінскай Канстытуцыяй. **(Бурныя, доўга незмаўкаючыя апладысменты, усе ўстаюць, крыкі «Ура!», «Няхай жыве таварыш Сталін!»).**

Жыццё ўсё-ж, сваёй чаргой, ідзе наперад. Наша краіна расце з дня на дзень і патрабуе новых арганізацыйных форм. Гэтым і выклікаюцца змены і дадаткі, уносімыя ў нашу Канстытуцыю. Гэта неабходна. Гэта адпавядае таму, што расце, мацнее і ўдасканальваецца наш совецкі лад.

Ва ўсім гэтым мы бачым сілу і значэнне той справы, якая цяпер у нашых руках, у руках працоўных, — ва ўсім гэтым мы бачым вялікае значэнне і магутную сілу справы Леніна—Сталіна! **(Бурныя, працяжныя апладысменты, усе ўстаюць, воклічы «Ура!», «Няхай жыве таварыш Сталін!», «Няхай жыве таварыш Молатаў!»).**

Прамова тав. В. М. МОЛАТАВА
АБ УТВАРЭННІ УРАДА СССР

(ПРАЦЯГ)

ноўчыя бакі, калі ён гаварыў наконт альпінізма, турызма і шахматнай справы. **(Смех у зале).** Але ў тым-та і справа, што ў наркома юстыцыі былі адзначаны станоўчыя бакі, але зусім не ў галіне работы Наркамюста... А нам трэба, каб Наркамюст працаваў, як узорны совецкі наркамат, на які ўскладзены нашай Канстытуцыяй новыя велізарныя задачы, чаго, на жаль, не зразумеў тав. Крыленка. Відавочна, гэта прыйдзецца ўлічыць пры зацвярджэнні складу Совета Народных Камісараў.

Далей — аб рабоце Наркамзага, створанага з Камітэта загатовак. Правільна ўказаў тав. Касіор, што, вылучаючы кіраўніком Камітэта загатовак тав. Кальцова, які мае нямалы мясцовы вопыт, мы разлічвалі на тое, што справы Камітэта загатовак значна палепшацца. Між тым, нозы кіраўнік не зразумеў нават свайго абавязку расчысціць органы Камітэта загатовак ад забраўшыхся туды шкоднікаў і ўсякай дрэні. Ён не праявіў ніякага густу ў гэтых адносінах, не паказаў сябе большэвіком у рабоце. Значыць, прыйдзецца пры зацвярджэнні складу Совета Народных Камісараў лічыцца і з гэтым фактам.

Нарэшце, аб Камітэце мастацтваў. Аб ім тут гаварылі двое з выступаўшых дэпутатаў. Абодва дэпутаты крытычна адзываліся аб кіраўніцтве Камітэта мастацтваў, але я сказаў-бы, што іх крытычныя заўвагі былі мінімальнымі. Справа з кіраўніцтвам Камітэта мастацтваў абстаіць у нас даволі нядобра. Колькі мы ні прабавалі дапамагчы цяперашняму кіраўніку — тав. Кержэнцаву выправіць справу, сам ён сапраўднай ініцыятывы і разумення сваіх абавязкаў не праявіў. Значыць, трэба ўлічыць і гэту акалічнасць пры зацвярджэнні новага складу Совета Народных Камісараў.

Вось, таварышы, тыя заўвагі, якія я павінен быў зрабіць, перш чым перайсці да агалашэння складу Совета Народных Камісараў.

Цяпер дазвольце перайсці да складу Урада.

Я не спыняюся на пытанні аб Старшыні Совета Народных Камісараў, пераходжу да намеснікаў Старшыні Соўнаркома.

У сучасны момант у нас два намеснікі Старшыні Совета Народных Камісараў, якія разам з тым з'яўляюцца Народнымі Камісарамі. У інтарэсах далейшай работы Совета Народных Камісараў, — а работы ў Соўнаркоме становіцца ўсё больш! — я прашу аб тым, каб намеснікі Старшыні Соўнаркома былі вызвалены ад наркамацкіх пасад і цалкам былі-б заняты работай у Совеце Народных Камісараў.

У адпаведнасці з гэтым, уношу наступныя прапановы:

Зацвердзіць намеснікам Старшыні Совета Народных Камісараў Власа Якаўлевіча **Чубара (бурныя апладысменты)**, з аслабаненнем яго ад абавязкаў Народнага Камісара Фінансаў.

Уношу, далей, прапанову — зацвердзіць намеснікам Старшыні Совета Народных Камісараў Анастаса Іванавіча **Мікаяна (бурныя апладысменты)**, з аслабаненнем яго ад абавязкаў Народнага Камісара харчовай прамысловасці.

Уношу таксама прапанову—зацвердзіць яшчэ аднаго намесніка Старшыні Совета Народных Камісараў, назначыўшы яго і Старшынёй Камісіі Совецкага Кантролю — Станіслава Вікенцьевіча **Касіора. (Бурныя апладысменты).**

Прашу зацвердзіць Старшынёй Дзяржаўнай Планавай Камісіі Нікалая Алексеевіча **Вазнясенскага (Апладысменты).**

Народным Камісарам па замежных справах — Максіма Максімавіча **Літвінава. (Апладысменты).**

Народным Камісарам Унутраных Спраў — Нікалая Іванавіча **Ежова! (Працяглыя апладысменты).**

Народным Камісарам абароны — Клімента Ефрэмавіча **Варашылава. (Бурныя, працяглыя апладысменты, усе ўстаюць, па зале пракатваецца магутнае «Ура таварышу Варашылаву!», «Няхай жыве таварыш Варашылаў!»).**

Народным Камісарам Ваенна-Морскага Флота — Петра Александравіча **Смірнова. (Апладысменты).**

Народным Камісарам Цяжкай Прамысловасці — Лазара Майсеевіча **Кагановіча. (Бурныя, працяглыя апладысменты, воклічы: «Няхай жыве таварыш Кагановіч!», «Ура таварышу Кагановічу!». Усе ўстаюць).**

Народным Камісарам Машынабудаўніцтва — Александра Давыдавіча **Брускіна. (Апладысменты).**

Народным Камісарам Абароннай Прамысловасці — Міхаіла Майсеевіча **Кагановіча. (Апладысменты).**

Народным Камісарам Харчовай Прамысловасці — Абрама Лазаравіча **Гілінскага. (Апладысменты).**

Народным Камісарам Лёгкай Прамысловасці — Васілія Іванавіча **Шэстакова. (Апладысменты).**

Народным Камісарам Лясной Прамысловасці — Міхаіла Іванавіча **Рыжова. (Апладысменты).**

Народным Камісарам Шляхоў Зносін — Алексея Венедзіктавіча **Бакуліна. (Апладысменты).**

Народным Камісарам Воднага Транспарта — Нікалая Іванавіча **Пахомава (Апладысменты).**

Народным Камісарам Сувязі — Матвея Давыдавіча **Бермана. (Апладысменты).**

Народным Камісарам Земляробства — Роберта Індрыкавіча **Эйхе. (Апладысменты).**

Народным Камісарам Соўгасаў—Тіхана Александравіча **Юркіна. (Апладысменты).**

Народным Камісарам Загатовак — Міхаіла Васільевіча **Папова. (Апладысменты).**

Народным Камісарам Фінансаў — Арсенія Грыгор'евіча **Зверава. (Апладысменты).**

Народным Камісарам Гандлю — Міхаіла Паўлавіча **Смірнова. (Апладысменты).**

Народным Камісарам Знешняга Гандлю — Еўгенія Дзенісавіча **Чвялева. (Апладысменты).**

Народным Камісарам Юстыцыі — Нікалая Міхайлавіча **Рычкова. (Апладысменты).**

Народным Камісарам Аховы Здароўя— Міхаіла Фёдаравіча **Болдырэва. (Апладысменты).**

Старшынёй Дзяржаўнага Банка — Алексея Петровіча **Грычманава. (Апладысменты).**

Старшынёй Камітэта па справах вышэйшай школы — Сергея Васільевіча **Кафтанава. (Апладысменты).**

Старшынёй Камітэта па справах мастацтваў — Алексея Іванавіча **Назарава. (Апладысменты).**

Таварышы, мне няма неабходнасці даваць асобныя тлумачэнні аб кіраўніках наркаматаў, імёны якіх я тут агаласіў. Вы і без таго іх добра ведаеце.

Совету Народных Камісараў, які будзе вамі зацверджан, належыць вялікая работа, прадстаіць рашэнне яшчэ больш складаных задач, чым было да гэтага часу. Расце наша справа, растуць і нашы задачы.

Мне прыйшлося ўжо гаварыць аб крытычных заўвагах, якія былі зроблены дэпутатамі ў адносінах асобных наркаматаў. Нельга не прызнаць, што за работу наркаматаў адказвае Соўнарком, а таму павінна быць ясна, што крытычныя заўвагі аб рабоце наркаматаў адносяцца ў вядомай меры і да самога Соўнаркома. Зробленыя заўвагі павінны быць улічаны ўсімі наркаматамі і Урадам у цэлым.

Крытыку недахопаў наркаматаў Соўнарком разглядае і будзе разглядаць, як дапамогу і падтрыманне ў яго рабоце. З гэтай крытыкі мы павінны зрабіць вывад — значыць Соўнарком павінен яшчэ больш і значна лепш дапамагаць больш слабым наркаматам, узмацніць свой кантроль у адносінах іх работы, своечасова замяняць неадпавядаючых справе кіраўнікоў.

Кіраўнікі, якія стаяць на высокіх дзяржаўных пастах, не павінны аддавацца зазнайству або самазадаволенню, павінны сур'ёзна прыслухоўвацца да крытыкі, павінны ўдасканальвацца ў рабоце. Зазнайства, якое выражаецца ў такім прадстаўленні: «Я высока стаю і таму я ўсё бачу і ўсё ведаю», — мы павінны асудзіць, як палітычную блізарукасць, як чванства, як бюракратызм.

Лепш будзе, таварышы, калі мы будзем памятаць знакамітыя словы таварыша Сталіна, сказаныя ім нядаўна на прыёме металургаў і гарнякоў:

«Быць кіраўніком у совецкіх умовах — значыць удастоіцца высокага гонару і давер'я ў вачах народа... Кіраўнікі прыходзяць і ўходзяць, а народ астаецца. Толькі народ бессмяротны. Усё астатняе — праходзячае. Таму трэба ўмець даражыць давер'ем народа». **(Апладысменты).**

«Умець даражыць давер'ем народа» — такі асноўны абавязак Совета Народных Камісараў, такі асноўны абавязак кожнага з дзяржаўных кіраўнікоў.

Выбары ў Вярхоўны Совет і ўмацаваўшыйся за гэты час блок комуністаў і беспартыйных адкрываюць новую старонку ў гісторыі нашай краіны, у гісторыі соцыялізма. Вярхоўнаму Совету, выбранаму пераможным блокам комуністаў і беспартыйных, мы павінны заявіць: «Мы, кіраўнікі — **комуністы,** якія ведаюць, што поспех нашай работы будзе тым значней, чым больш і чым мацней будзе ажыццяўляцца наша штодзённая і жывая сувязь з шматмільённымі **беспартыйнымі** масамі працоўных. **(Апладысменты).**

У нас у Совецкім Саюзе склалася нябачанае раней і не існуючае ў іншых краінах, дзе капіталізм раздзірае грамадства на класы, — у нас склалася на аснове перамогі ўлады працоўных маральнае і палітычнае адзінства народа, таму што ў нашай краіне зблізіліся і злучыліся ў адно цэлае дзве вялікія сілы: народ і комунізм. **(Бурныя апладысменты).**

Усё гэта накладвае на нас, на кіраўнікоў, вялікія абавязкі. Каб зразумець гэтыя абавязкі, мы павінны памятаць аб тым, што гаварыў таварыш Сталін на сходзе выбаршчыкаў Сталінскай акругі ў Маскве напярэдадні выбараў дэпутатаў Вярхоўнага Совета. Ён гаварыў:

«Выбаршчыкі, народ павінны патрабаваць ад сваіх дэпутатаў, каб яны асталіся на вышыні сваіх задач, каб яны ў сваёй рабоце не спускаліся да ўзроўню палітычных абывацеляў, каб яны аставаліся на пасту палітычных дзеячоў ленінскага тыпу, каб яны былі такімі-ж яснымі і пэўнымі дзеячамі, як Ленін **(апладысменты)**, каб яны былі такімі-ж бясстрашнымі ў баю і бязлітаснымі да ворагаў народа, якім быў Ленін **(апладысменты)**, каб яны былі свабодны ад усякай панікі, ад усякага падабенства панікі, калі справа пачынае ўскладняцца і на гарызонце вырысоўваецца якая-небудзь небяспека, каб яны былі гэтак-жа свабодны ад усякага падабенства панікі, як быў свабодны Ленін **(апладысменты)**, каб яны былі гэтак-жа мудры і непаспешлівы пры вырашэнні складаных пытанняў, дзе патрэбна ўсебаковая арыентацыя і ўсебаковы ўлік усіх плюсаў і мінусаў, якім быў Ленін **(апладысменты)**, каб яны былі гэтак-жа праўдзівы і чэсны, якім быў Ленін **(апладысменты)**, каб яны гэтак-жа любілі свой народ, як любіў яго Ленін. **(Апладысменты)».**

Таварыш Сталін гаварыў далей аб тым, што дэпутаты «павінны мець перад сабой вялікі вобраз вялікага Леніна і пераймаць Леніну ва ўсім». **(Шумныя апладысменты).**

Таварыш Сталін прад'явіў гэтыя высокія патрабаванні да дэпутатаў Вярхоўнага Совета. Тым больш усё гэта адносіцца да Народных Камісараў і да Совета Народных Камісараў у цэлым. Мы павінны памятаць аб тым, што Совет Народных Камісараў з самага пачатку яго ўтварэння ўзначальваў Ленін, і павінны імкнуцца да таго, каб быць дастойнымі вучнямі вялікага Леніна, заклаўшага асновы ўсёй нашай справы. **(Шумныя, працяглыя апладысменты).**

Мы хочам быць вернымі памочнікамі нашага настаўніка і правадыра народаў Совецкага Саюза — вялікага Сталіна. Ва ўсіх важных пытаннях мы, Совет Народных Камісараў, звернемся за парадай і за ўказаннем да Цэнтральнага Камітэта большэвіцкай партыі, перш за ўсё, да таварыша Сталіна. **(Шумная авацыя, усе ўстаюць, воклічы з зала: «Няхай жыве правадыр вялікага совецкага народа вялікі Сталін!», «Правадыру і настаўніку таварышу Сталіну ўра!»).**

Вы ведаеце, таварышы, што гэта і па сутнасці і па форме адпавядае нашай вялікай Канстытуцыі. **(Апладысменты).**

Мы хочам быць дастойнымі нашага соцыялістычнага народнага парламента — Вярхоўнага Совета, хочам быць дастойнымі народа, будуючага сваімі працоўнымі намаганнямі, самаадданасцю і творчым энтузіязмам, наперакор усім і ўсякім перашкодам, комуністычнае грамадства. **(Шумныя апладысменты).**

У заключэнне скажу словамі таварыша Сталіна: «Што датычыць нас, членаў ЦК, членаў урада, то няма ў нас іншага жыцця, чым жыццё для нашай вялікай справы, чым жыццё для барацьбы за ўсеагульны дабрабыт народа, за радасць для ўсіх працоўных, для мільённых мас». **(Бурныя, працяглыя апладысменты, якія пераходзяць у авацыю. Усе ўстаюць. Прывітальныя воклічы па адрасу таварыша Сталіна і Молатава на мовах брацкіх рэспублік і воклічы «Ура!» пракатваюцца па зале).**

Прамова дэпутата А. А. ЖДАНАВА

Таварышы дэпутаты Вярхоўнага Совета! Заява, агалошаная тут старшынствуючым ад імя Совета Народных Камісараў, падпісаная Старшынёй Совета Народных Камісараў Вячаславам Міхайлавічам Молатавым, аб зладжанні ўрадам поўнамоцтваў, знаходзіцца ў поўнай адпаведнасці з нашым Асноўным Законам — Канстытуцыяй СССР.

Я думаю, што выкажу агульную думку ўсіх дэпутатаў Вярхоўнага Совета, калі скажу, што Вярхоўны Совет аднадушны ў сваім выражэнні давер'я Совету Народных Камісараў.

(Прысутныя ў зале ўстаюць, бурна апладыруюць, апладысменты пераходзяць у авацыю, воклічы: «Ура!»).

Галасы з месц: «Няхай жыве дэпутат Вярхоўнага Совета Вячаслаў Міхайлавіч Молатаў!» (Бурныя апладысменты, воклічы: «Ура!»).

Таварышы! Народныя масы нашай вялікай радзімы, якія паслалі нас у якасці сваіх выбраннікаў у Вярхоўны Совет Совецкага Саюза, на выбарах 12 снежня аднадушна аддалі свае галасы за падтрыманне той палітыкі, якую праводзіў і праводзіць Совецкі Урад, за палітыку ленінска-сталінскай партыі і совецкай улады, за паслядоўнае правядзенне гэтай палітыкі як у знешніх, так і ва ўнутраных справах на карысць нашай вялікай радзімы. **(Бурныя апладысменты).**

Я ўношу прапанову аб тым, каб даручыць Вячаславу Міхайлавічу Молатаву прадставіць у Вярхоўны Совет свае прапановы аб складзе Урада — Совета Народных Камісараў Саюза ССР.

(Усе прысутныя ўстаюць, бурныя апладысменты, апладысменты пераходзяць у авацыю, воклічы «Ура!»).

Таварышы, у сувязі з абмеркаваннем пытання аб стварэнні Урада — Совета Народных Камісараў Саюза ССР — я хацеў-бы зрабіць некалькі заўваг аб дзейнасці некаторых Наркаматаў. Відаць, справа абстаіць так, што асобныя дэфекты і цянявыя бакі ёсць у раду нашых Наркаматаў.

Я ўзяў слова як дэпутат Ленінграда. Можа быць, нам, работнікам з месц, не ўсё ясна і не ўсё зразумела ў дзейнасці нашых Наркаматаў, але, гавораць, з боку сёе-тое больш відаць.

Я хацеў-бы сказаць некалькі слоў аб дзейнасці Народнага Камісарыята Замежных Спраў.

Таварышы, я думаю, у нас няма розных думак па поваду таго, што НКЗС пад кіраўніцтвам нашага Совецкага Урада праводзіць паслядоўную палітыку міру і што наш паважаны нарком Максім Максімавіч Літвінаў мае велізарныя заслугі ў справе правядзення мірнай палітыкі Совецкай дзяржавы. **(Бурныя апладысменты, усе дэпутаты ўстаюць).**

У мяне ёсць некалькі пытанняў, якія датычаць практычнай дзейнасці НКЗС, па якіх я хацеў-бы атрымаць тлумачэнне.

Першае пытанне, па якому мне хацелася-б атрымаць тлумачэнне: у нас, у Ленінградзе, ёсць вельмі вялікая колькасць консулаў розных замежных дзяржаў. У нас, у Ленінградзе, амаль кожная замежная дзяржава мае свайго консула. Пры гэтым я павінен сказаць, што частка з гэтых консулаў яўна выходзіць за рамкі сваіх поўнамоцтваў і абавязкаў і вядзе сябе незадаволена, займаючыся падрыўной дзейнасцю супроць народа і краіны, у якой яны прадстаўлены.

Ведома таксама, што СССР у гэтых краінах не мае роўнай колькасці консулаў. У мяне ўзнікае пытанне: чаму гэта так? Чаму НКЗС дапускае такое становішча, пры якім колькасць консулаў прадстаўляючых замежныя дзяржавы ў СССР не роўна, а больш колькасці консулаў, прадстаўляючых СССР у замежных дзяржавах. Ці не вынікае з сілы і магутнасці нашай вялікай соцыялістычнай дзяржавы роўнасць консульскіх прадстаўніцтваў як нашых у заграпічных краінах, так і замежных? **(Апладысменты).**

Пераходжу да другога пытання, па якому я хацеў-бы атрымаць некаторае тлумачэнне. Я думаю, што НКЗС трэба было-б быць больш рашучым у адносінах наглых, хуліганскіх і правакацыйных выхадак агентаў Японіі і так званага марыянетачнага Манчжоу-Го. **(Бурныя апладысменты).**

Таварышы, наглядаючы за развіццём нашых адносін на Далёкім Усходзе, усе мы бачым, што рэдка праходзяць дні, калі на нашых усходніх граніцах не адбывалася-б якая-небудзь чарговая правакацыйная вылазка з боку агентаў Японіі і так званага Манчжоу-Го.

Аб гэтым гаворыць хоць-бы апошні факт зусім незаконнага і грубага парушэння і папірання агульнапрызнаных норм права і зносін паміж народамі — факт правакацыйнага затрымання нашага грамадзянскага самалёта, які вёз пасажыраў і пошту. Наколькі нам вядома, — да гэтага часу дзейсных мер у адносінах звароту самалёта і грузаў, якія ў ім знаходзіліся, не прынята.

Мне здаецца, грамадская думка ўсіх працоўных нашай краіны аднадушна ў тым, каб па лініі нашай дыпламатыі былі прыняты дзейсныя меры да такога ўрэгулявання адносін на нашай усходняй граніцы, якія-б зрабілі немагчымымі, раз і назаўсёды, якія-небудзь правакацыйныя выхадкі з боку хуліганствуючых агентаў японскага імперыялізма. **(Шумныя адабрэнні).**

Потым, таварышы, я не разумею, што творыцца зараз ва Францыі.

Як разумець становішча, калі ўрад краіны, з якой мы — СССР — знаходзімся ў даволі цесных адносінах і з якой у нас, як быццам-бы, адбываецца збліжэнне, дапускае на сваёй тэрыторыі існаванне арганізацый, прапаведуючых і арганізуючых тэрарызм супроць СССР?

Гавораць, што гэта робіцца на падставе закона аб праве прытулку для іншаземцаў. Мне здаецца, што гэта не так.

Мне здаецца, што факт існавання на французскай тэрыторыі, на тэрыторыі дзяржавы, з якой мы знаходзімся ў нармальных адносінах, з якой мы маем пакт аб узаемнай дапамозе, — факт існавання такога роду арганізацый прадстаўляе сабою нішто іншае, як спецыяльнае і заведамае заахвочванне актыўнай, варожай дзейнасці ўсякіх мярзотнікаў, рускага і нярускага паходжання, з боку ўрада, з якім мы маем пакт аб узаемнай дапамозе.

І мы тут павінны запытаць: існуе гэты пакт ці не існуе, ці ёсць на справе гэты пакт ці не? І я хацеў-бы, каб Старшыня Совета Народных Камісараў СССР звярнуў увагу на гэтыя дэфекты і прыняў адпаведныя меры для іх устаранення. **(Апладысменты).**

Таварышы, я хацеў-бы сказаць таксама некалькі слоў аб дзейнасці аднаго камісарыята, які мае вялікае значэнне для нашай народнай гаспадаркі. Я маю на ўвазе Народны Камісарыят Воднага Транспарта.

Як-быццам у нас на поўдні Совецкага Саюза яшчэ не закрыта навігацыя. Я маю на ўвазе Каспійскае мора, а роўна і іншыя моры і рэкі, размешчаныя на поўдні нашага Совецкага Саюза. А ў той-жа самы час, калі глядзіш на дзейнасць Народнага Камісарыята Воднага Транспарта, атрымліваецца такое ўражанне, што наогул усё і ўсюды замёрзла. Як-быццам замёрзлі рэкі, моры і акіяны, амываючыя наш Совецкі Саюз. **(Апладысменты. Смех).**

Я хачу сказаць аб тым, што транспартныя сродкі, якія знаходзяцца ў вядзенні Народнага Камісарыята Воднага Транспарта, скарыстоўваюцца вельмі нездавальняюча. Аварыі, на рост якіх не раз звярталі ўвагу Наркамвода і Урад, і партыя, і совецкая грамадскасць, гэтыя аварыі працягваюць аставацца бічом воднага транспарта. Стратнасць, якая суправаджала дзейнасць Наркамвода ў 1936 г. і тлумачылася ім усякага роду спасылаканнямі на розныя аб'ектыўныя ўмовы, як, напрыклад, на мелкаводдзе 1936 г., гэта стратнасць не мела тэндэнцыі да зніжэння і ў 1937 г., як-быццам ва ўсіх адносінах спрыяючым для навігацыі як па морах, так і па рэках Совецкага Саюза.

Я павінен звярнуць увагу на той факт, што перавозкі нафты, якія маюць такое велізарнае значэнне для народнай гаспадаркі нашай краіны, знаходзяцца зараз у такім становішчы, што з Баку замест 12 тыс. тон штодзённай пагрузкі нафтавых прадуктаў на поўнач грузіцца зараз толькі 4 тыс. тон, не глядзячы на зусім дастатковую колькасць цягі і танажа. Гэта прымушае зварочваць нафту назад у нафтавыя амбары для захоўвання, бо Наркамвод не прымае яе да пагрузкі.

Я хацеў-бы звярнуць увагу на вельмі нездавальняючае становішча са справай вылучэння і падрыхтоўкі маладых кадраў на водным транспарце. Аб гэтым вельмі многа гаворыць наша совецкая грамадскасць, многа піша наш друк.

Таварышы, мы народ цярплівы, але трэба з той мелі, на якой сядзіць Наркамвод на працягу некалькіх год, злазіць пахутчэй **(смех)** і пайсці, калі ўжо не самым поўным, то, ва ўсякім выпадку, і не тым ціхім ходам, якім Наркамвод вядзе караблі нашага воднага транспарта. Неабходна ў гэтых адносінах перамагчы спакой і добрадушнасць, якая ў значнай ступені ўласціва нашаму Наркамату і яго кіраўніцтву, і папярэдзіць, што калі так справа будзе працягвацца са становішчам воднага транспарта, то грамадскае цярпенне можа лопнуць, і калі справа да наступнай сесіі не будзе папраўлена, як-бы і раней не пракукавала зязюля ў адносінах кіраўніцтва Народнага Камісарыята Воднага Транспарта. **(Смех).**

Я не патрабую неадкладнага зняцця Народнага Камісара, але думаю, што Вярхоўны Совет павінен у гэтых адносінах прапанаваць Народнаму Камісарыяту Воднага Транспарта аб неабходнасці працаваць значна лепш, чым ён працуе да гэтага часу!

Есць яшчэ адна галіна совецкай работы, якая мае надзвычай важнае значэнне. Я маю на ўвазе совецкае мастацтва. Ведома, якое велізарнае значэнне мае совецкае мастацтва для нашага народа. Ведома, што развіццё совецкага мастацтва звязана з задаволеннем растучых культурных патрэб працоўных нашай краіны. Усе ведаюць, што гэты рост совецкага мастацтва знаходзіцца ў цеснай сувязі з перамогай соцыялізма, які прадстаўляе неабмежаваныя магчымасці для росту і развіцця ўсіх чалавечых патрэб і для іх задавальнення.

У адпаведнасці з ростам культурных патрэб ідзе ў мастацтве рост маладых дараванняў. Усе мы з'яўляемся сведкамі таго, якім пышным цветам квітнеюць у нашай краіне маладыя дараванні і таленты. Совецкая ўлада, Совецкі Урад акружае наша мастацтва ва ўсіх саюзных рэспубліках неаслабнай увагай і клопатамі. Я думаю, што па гэтаму поваду мне няма патрэбы многа гаварыць,—гэта ўсім ясна.

У гэтых умовах Камітэт па справах мастацтваў пры Совеце Народных Камісараў СССР павінен быў разгарнуць сапраўдную работу і выкарыстаць выключна спрыяючую абстаноўку для развіцця совецкага мастацтва, каб рабіць сапраўды вялікія справы.

А калі ўзяць кіраўніцтва Камітэта па справах мастацтваў і старшыню Камітэта таварыша Кержэнцава, як яно зараз выглядае, то я не ведаю, магчыма, гэта кіраўніцтва адчуваецца ў якіх-небудзь гарадах, краях, абласцях і саюзных рэспубліках нашага Совецкага Саюза, але мы ў Ленінградзе гэтага кіраўніцтва не адчуваем. **(Смех).**

Узяць хоць-бы пытанне адносна ідэйнай вытрыманасці рэпертуара. Усім памятна гісторыя з пастаноўкай антыгістарычнай і палітычна двурушніцкай п'есы «Багатыры», у якой быў арганізаван сапраўдны здзек над гісторыяй рускага народа. Ведома нядаўняя пастанова аб ліквідацыі тэатра Мейерхольда — чуждага совецкаму мастацтву. Незразумела, аднак, чаму Камітэт па справах мастацтваў і яго кіраўнік таварыш Кержэнцаў на працягу такога доўгага часу дапускалі існаванне ў сябе пад бокам, у Маскве, тэатра, які сваім крыўляннем і трукацтвам прабаваў апашліць п'есы класічнага рэпертуара, не стварыў ні адной сапраўднай совецкай п'есы, разлажыў акцёрскі калектыў тэатра і ў той-жа самы час знаходзіўся пад нясупыннай падтрымкай Камітэта па справах мастацтваў, які ўвесь час яму прадастаўляў шырокія дзяржаўныя субсідыі? Хіба гэта не сведчыць аб тым, што кіраўніцтва Камітэта па справах мастацтваў знаходзіцца ў нездавальняючым становішчы.

Я хацеў-бы яшчэ ўказаць на нядаўна меўшы месца факт, калі ў сувязі з конкурсам піяністаў старшыня Камітэта таварыш Кержэнцаў адвёў ад удзелу ў конкурсе рад маладых музыкантаў без усякіх на гэта падстаў, толькі ў сувязі з тым, што некаторыя з гэтых музыкантаў мелі калісьці, дзесьці далёкіх сваякоў, не ўпаўне вытрыманых у палітычных адносінах, і за грахі гэтых вельмі аддаленых сваякоў, з якіх многія памерлі шмат дзесяткаў год таму назад, таварыш Кержэнцаў схілен быў спагнаць з гэтых маладых таленавітых людзей і на гэтай падставе не дапусціць іх да ўдзелу ў конкурсе.

Што гэта — кіраўніцтва або пародыя на кіраўніцтва? — управе мы запытаць!

Не так даўно старшыня Камітэта па справах мастацтваў таварыш Кержэнцаў прабаваў закрыць аддзяленне нацыянальных кадраў пры Маскоўскай кансерваторыі. Гэта закрыццё падрыхтоўвалася наперакор неаднаразовым указанням Совецкага Урада аб усямернай падтрымцы справы развіцця нацыянальных кадраў у мастацтве.

Я думаю, што гэтых фактаў дастаткова для таго, каб запытаць: ці патрэбен нам такі старшыня Камітэта па справах мастацтваў і хто ён такі—кіраўнік Камітэта па справах мастацтваў, ці комівояжэр? **(Смех).** Незадачлівы ў нас старшыня Камітэта па справах мастацтваў! **(Галасы: «Правільна». Апладысменты).**

Я думаю, што мы можам забяспечыць такое кіраўніцтва справай мастацтваў у нашай краіне, якое-б упаўне адпавядала значэнню і зместу гэтай вялікай і слаўнай задачы.

Я думаю, што Старшыня Совета Народных Камісараў уліча мае крытычныя заўвагі ў далейшай рабоце Совета Народных Камісараў з тым, каб гэтыя дэфекты ў дзейнасці асобных народных камісарыятаў былі выпраўлены. **(Апладысменты).**

ІНФАРМАЦЫЙНАЕ ПАВЕДАМЛЕННЕ АБ СУМЕСНЫМ ПАСЯДЖЭННІ СОВЕТА САЮЗА І СОВЕТА НАЦЫЯНАЛЬНАСЦЕЙ 19 студзеня 1938 г.

19 студзеня, у 2 гадзіны дня, у зале пасяджэнняў Совета Саюза, у Крэмлі, адбылося трэцяе, заключнае сумеснае пасяджэнне Совета Саюза і Совета Нацыянальнасцей.

Старшынствуе Старшыня Совета Саюза **А. А. Андрэеў.**

Па пункту 5 парадка дня — Аб назначэнні пракурора СССР — выступае дэпутат **Г. І. Петроўскі.** Ад імя Советаў старэйшын Совета Саюза і Совета Нацыянальнасцей дэпутат Петроўскі прапануе назначыць пракурорам СССР дэпутата **А. Я. Вышынскага.**

Вярхоўны Совет назначае дэпутата А. Я. Вышынскага пракурорам СССР.

Далей сумеснае пасяджэнне палат пераходзіць да разгляду пытання аб фармаванні Совета Народных Камісараў СССР. Дэпутат **В. М. Молатаў** уносіць на разгляд Вярхоўнага Совета склад Совета Народных Камісараў СССР.

В. М. Молатаў у сваёй прамове адказвае на заўвагі і пытанні дэпутатаў зробленыя на папярэднім пасяджэнні ў спрэчках па пытанню аб утварэнні Ўрада СССР.

Персанальным галасаваннем Вярхоўны Совет утварае наступны склад урада СССР — Совета Народных Камісараў СССР:

Старшыня Совета Народных Камісараў СССР —

ВЯЧЭСЛАЎ МІХАЙЛАВІЧ МОЛАТАЎ.

Намеснікі Старшыні Совета Народных Камісараў СССР —

ВЛАС ЯКАЎЛЕВІЧ ЧУБАР,

АНАСТАС ІВАНАВІЧ МІКАЯН.

Намеснік Старшыні Совета Народных Камісараў СССР і Старшыня Камісіі Совецкага Кантроля —

СТАНІСЛАЎ ВІКЕНЦЬЕВІЧ КАСІОР.

Старшыня Дзяржплана СССР—**Нікалай Аляксеевіч Вазнесенскі.**

Народны камісар замежных спраў — **Максім Максімавіч Літвінаў.**

Народны камісар унутраных спраў — **Нікалай Іванавіч Ежоў.**

Народны камісар абароны — **Клімент Ефрэмавіч Варашылаў.**

Народны камісар Ваенна-Марскога Флота — **Пётр Аляксандравіч Смірноў.**

Народны камісар цяжкай прамысловасці — **Лазар Майсеевіч Кагановіч.**

Народны камісар машынабудаўніцтва — **Аляксандр Давідавіч Брускін.**

Народны камісар абароннай прамысловасці — **Міхаіл Майсеевіч Кагановіч.**

Народны камісар харчовай прамысловасці — **Абрам Лазаравіч Гілінскі.**

Народны камісар лёгкай прамысловасці — **Васілій Іванавіч Шэстакоў.**

Народны камісар лясной прамысловасці — **Міхаіл Іванавіч Рыжоў.**

Народны камісар шляхоў зносін — **Аляксей Венедыктавіч Бакулін.**

Народны камісар воднага транспарта — **Нікалай Іванавіч Пахомаў.**

Народны камісар сувязі — **Мацвей Давідавіч Берман.**

Народны камісар земляробства **Роберт Індрыкавіч Эйхе.**

Народны камісар зернавых і жывёлагадоўчых соўгасаў — **Ціхон Аляксандравіч Юркін.**

Народны камісар загатовак — **Міхаіл Васільевіч Папоў.**

Народны камісар фінансаў — **Арсеній Грыгор'евіч Зверэў.**

Народны камісар гандля — **Міхаіл Паўлавіч Смірноў.**

Народны камісар знешняга гандля — **Еўгеній Дзянісавіч Чвялеў.**

Народны камісар юстыцыі — **Нікалай Міхайлавіч Рычкоў.**

Народны камісар аховы здароўя — **Міхаіл Фёдаравіч Болдыраў.**

Старшыня праўлення Дзяржаўнага банка — **Аляксей Пятровіч Грычманаў.**

Старшыня камітэта па справах вышэйшай школы — **Сяргей Васільевіч Кафтанаў.**

Старшыня камітэта па справах мастацтваў — **Аляксей Іванавіч Назараў.**

На пасяджэнне Вярхоўнага Совета прыбываюць дэлегацыі ад рабочых, работніц калгаснікаў, калгасніц, інтэлігенцыі і служачых раду рэспублік, гарадоў і абласцей а таксама ад Чырвонай Арміі і Ваенна-Морскага Флота.

Парадак дня Сесіі вычарпан. Старшынствуючы Старшыня Совета Саюза **А. А. Андрэеў** паведамляе, што па ўсіх пытаннях парадка дня Вярхоўным Советам прыняты аднагалосныя рашэнні і абвяшчае першую Сесію Вярхоўнага Совета СССР закрытай.

Адказны рэдактар І. ГУРСКІ.

Друкарня газеты «Звязда».
Газета «Літаратура і Мастацтва» выходзіць раз у пяцідзёнку. Адрас рэдакцыі: Менск, Совецкая 68, тэл. сакр. 25-394, рэдактара 20-831.
Уп. Галоўлітбела № 4080